СЁННЯ — АПОШНІ ДЗЕНЬ ПАДПІСКІ
на «Звязду» на IV квартал.
Хто не паспеў падпісацца —
СПЯШАЙЦЕСЯ!

*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

27 ВЕРАСНЯ 2008 г.
СУБОТА
№ 183
(26296)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

У карпункт прыйшло пісьмо

## «АДКАЗЫ ЁСЦЬ, ЛОГІКІ НЯМА...»

У брэсцкі карпункт газеты прыйшло пісьмо ад жыхароў вёскі Русіно Баранавіцкага раёна. У пісьме нашы чытачы не просяць дапамогі ў пошуках справядлівасці, а, хутчэй, дзеляцца скрухай, што не змаглі яе знайсці. Яны не раз звярталіся да кіраўніцтва чыгункі самі, звярталіся з дапамогай дэпутата Палаты прадстаўнікоў па сваёй акрузе. Але адказы, атрыманыя на імя жыхароў, а таксама на імя парламентарыя няўрымслівых русіноўцаў не задавальняюць. Іх праблема датычыцца кошту білетаў. Русіно — прыгарадны населены пункт, усяго за пяць кіламетраў ад горада. Многія жыхары ездзяць штодня на працу ў Баранавічы. А пенсіянеры — у магазіны, паліклініку, іншыя ўстановы. Білет да горада на лунінецкі і слуцкі дызель-цягнікі каштуе 880 рублёў. Па цяперашнім часе, можа, і нямнога. Але ў людзей узнікае заканамернае пытанне: чаму білет да станцыі Юшкавічы, якая на адлегласці 16 кіламетраў ад горада (праўда, на мінскую электрычку) каштуе 440 рублёў?

У адказах кіраўніцтва беларускай чыгункі, копіі якіх даслалі разам з пісьмом яго аўтары, здавалася б, усё патлумачана. Вось цытата з аднаго з іх: *«На чыгунках былога Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік пры продажы білетаў на прыгарадныя цягнікі дзейнічаў зонны тарыф. Размеркаванне станцый і прыпыначных пунктаў па зонах праводзілася па схеме: першая зона — з 1 да 5 кіламетраў, другая — з 6 да 15 кіламетраў, трэцяя — з 16 да 25 кіламетраў, чацвёртая — з 26 да 35 кіламетраў, пятая — з 36 да 45 кіламетраў, шостая — з 46 да 55 кіламетраў, сёмая — з 56 да 65 кіламетраў і г.д. Разбіўка зонаў ажыццяўлялася ад галоўнай станцыі (нулявой зоны). На ўчастку Баранавічы Палескія — Лунінец разбіўка зонаў была ажыццёўлена ад станцыі Баранавічы Палескія.*

*Аналагічная разбіўка прыгарадных участкаў на зоны дзейнічае і ў цяперашні час.*

*Адлегласць паездкі ад станцыі Баранавічы Палескія да станцыі Русіно складае шэсць кіламетраў, што адпавядае другой зоне. За прайшоўшы час нумар зоны да станцыі Русіно не змяніўся. Кошт праезду ад станцыі Баранавічы Палескія спаганяецца правільна».*

Яшчэ адзін адказ, датаваны кастрычнікам мінулага года, і падпісаны першым намеснікам начальніка Беларускай чыгункі В. Лапцінскім, зноў пералічвае дзяленне на зоны і дае больш падрабязнае тлумачэнне парадку цэнаўтварэння на білеты: *«Інфармуем Вас, што тарыфы на перавозку пасажыраў чыгуначным транспартам ва ўнутрырэспубліканскіх стасунках устанаўліваюцца Мінэканомікі на падставе рашэння камісіі па каардынацыі дзейнасці дзяржаўных органаў па пытаннях цэнаўтварэння пры Савеце Міністраў Беларусі».*

І ўсё гэта людзі разумеюць: аўтары пісьма — праз аднаго былыя настаўнікі. Не разумеюць толькі, чаму за білет да Юшкавічаў, якія ў тры разы далей за Русіно, плаціць трэба напалову меней. У лісце ў газету, падпісаным Валянцінай Калько і яе аднавяскоўцамі, так і гаворыцца: «Логіка падказвае, што ў цягніках аднаго і таго ж класа: чым далей едзеш, тым болей трэба плаціць. А нам прыводзяць цэлую тэорыю пабудовы зонаў, а самі гэтай тэорыі, выходзіць, не прытрымліваюцца».

А можа ў адказах і знаходзіцца падказка да разгадкі цэнавага рэбуса: адны зоны зацвярджалі ў часы развітога сацыялізму часоў СССР, а іншыя разглядалі ўжо кампетэнтныя органы незалежнай дзяржавы.

Застаецца толькі гадаць, бо логіку шукаць ва ўтварэнні цэнаў на чыгуначныя білеты вельмі складана. Аўтару гэтых радкоў шмат даводзіцца ездзіць цягнікамі. Іншы раз і задумаешся: чаму? Чаму білет з Брэста да Мінска ў так званым «сядзячым» вагоне цягніка № 14 Берлін—Масква каштуе крыху менш за 13 тысяч рублёў, а на 106-м Брэст—Мінск у такім жа вагоне — 21 тысячу рублёў? Аб'ём сэрвісу і паслуг у абодвух цягніках аналагічны. Чаму білет з Брэста да Баранавічаў на цягнік № 50 каштуе 14 тысяч рублёў, а калі гэтым жа цягніком праехаць да Івацэвічаў, а потым з Івацэвічаў да Баранавічаў, то заплаціць давядзецца больш за 20 тысяч рублёў? Значыць, не толькі зоны бяруцца ў разлік, ёсць і іншыя крытэрыі. Якія?

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## НАРЭШЦЕ МІНЧАНЕ ЗАБУДУЦЬ ПРА АЎТОБУС № 33!

**Рэканструяваная станцыя «Кастрычніцкая» мінскага метрапалітэна была адкрытая ўчора: з 14.45 на ёй пачалі спыняцца цягнікі, а пасажыры змаглі ацаніць чатыры новыя эскалатары. Папярэдне планавалася адкрыць адрамантаваную станцыю 1 кастрычніка, але паколькі будаўніча-мантажныя і пусканаладачныя работы былі выкананыя трохі раней, то з адкрыццём вырашылі не марудзіць.**

Перасадачная станцыя «Кастрычніцкая» была закрыта 9 чэрвеня на рэканструкцыю з мэтай замены трох старых эскалатараў, якія не спраўляліся з пасажырапатокам, на новыя чатыры. Для забеспячэння перасадкі пасажыраў з адной лініі метро на другую быў пушчаны спецыяльны бясплатны аўтобус № 33. Новыя эскалатары выраблены ва Украіне, а манціравалі іх расіяне разам з нашымі спецыялістамі. Па словах намесніка галоўнага канструктара Крукаўскага вагонабудаўнічага завода Андрэя Гецьмана, тэрмін службы новых эскалатараў складае 50 гадоў, а гарантыйнае абслугоўванне — два гады.

**Начальнік службы руху КУП «Мінскі метрапалітэн» Рыгор ЯКІМКОЎ** лічыць, што праблема патоку пасажыраў вырашана:

— У Мінску такая рэканструкцыя адбылася ўпершыню. Калі пусцілі станцыю ў 1984 годзе, то ніхто не мог падумаць, што будзе такі паток пасажыраў. Плюс яшчэ дадаўся перасадачны вузел. І была сур'ёзная праблема. А чатыры ленты ў значнай ступені здымаюць яе. Да таго ж пасля пуску трэцяй лініі метрапалітэна з перасадачнымі станцыямі «плошча Леніна» і «Фрунзенская», праблема будзе наогул вырашана.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

## Добрасумленная самаадданая праца людзей — галоўны рэсурс дзяржавы

**Гэта адзначыў учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на цырымоніі ўручэння дзяржаўных узнагарод.**

«Мне сёння асабліва прыемна сустрэцца з вялікай групай нашых выдатных вучоных, педагогаў, іншых работнікаў сферы адукацыі. Мы вельмі высока цэнім ваш уклад у інтэлектуальнае развіццё грамадства. Дзякуй за ўсё значнае і каштоўнае, што вы ствараеце ў сферы фундаментальных і прыкладных навуковых даследаванняў, за падрыхтоўку кваліфікаваных спецыялістаў», — сказаў Прэзідэнт Беларусі. У прыватнасці, ордэн Францыска Скарыны ўручаны намесніку дырэктара Гродзенскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў Уладзіміру Сяргейчыку, ганаровае званне «Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь» прысвоена рэктару БДУ Васілю Стражаву.

Аляксандр Лукашэнка асабліва адзначыў працу медыкаў. Ён падзякаваў ім за добрасумленную працу, стварэнне навуковай школы, высокі прафесіяналізм і вялікі ўклад у распрацоўку прыярытэтных напрамкаў медыцынскай навукі. У прыватнасці, ордэна Пашаны ўдастоены прафесар 1-й кафедры хірургічных хвароб Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Сяргей Леановіч.

«Здароўе, фізічная і духоўная дасканаласць — гэтыя ўзаемадапаўняльныя паняцці заўсёды побач. Не выпадкова ў нашай краіне нават у самыя цяжкія часы пытанні падтрымкі культуры, мастацтва займалі прыярытэтнае месца. Бо ў іх не толькі залог здаровага, паўнацэннага развіцця грамадства, але і аснова грамадзянскага яднання», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі. Ганаровыя званні «Заслужаны майстар спорту Рэспублікі Беларусь» прысвоены, у прыватнасці, спартсменам — інструктарам нацыянальнай каманды па мастацкай гімнастыцы Ксеніі Санковіч, Аліне Тумілові ч.

Асаблівыя словы ўдзячнасці Аляксандр Лукашэнка выказаў дзеячам культуры і мастацтва, якія садзейнічаюць захаванню нацыянальных традыцый і развіццю багатага духоўнага свету беларускага народа. У прыватнасці, за значны ўклад у развіццё нацыянальнай культуры і прапаганду лепшых нацыянальных традыцый Падзяка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб'яўлена мастацкаму кіраўніку ансамбля «Сябры» Анатолю Ярмоленку.

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ўсё створанае народам мае патрэбу ў абароне. «Жыццё кожнага чалавека, усяго насельніцтва краіны павінна праходзіць у прававым полі, — адзначыў ён. — Таму цяжка пераацаніць значэнне часам непрыкметнай, але карпатлівай работы прадстаўнікоў Камітэта дзяржаўнага кантролю, юрыстаў, эканамістаў. Барацьба з парушэннямі закона, карупцыяй, утаймаванне эканамічнай і крымінальнай злачыннасці — важны напрамак палітыкі нашай дзяржавы. Мы ўсяляк падтрымліваем, заахвочваем тых, хто ўмела, разумна абараняе інтарэсы, правы грамадзян і дзяржавы».

## Прэзідэнт Беларусі павіншаваў «Гомсельмаш» з выпускам 10-тысячнага айчыннага камбайна

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў калектыў вытворчага аб'яднання «Гомсельмаш» з прафесійным святам і слаўнай працоўнай перамогай — выпускам 10-тысячнага айчыннага збожжаўборачнага камбайна.**

«Гэты поспех — заканамерны вынік вашага высокага прафесіяналізму, штодзённай самаадданай працы і творчага стаўлення да справы, — адзначаецца ў віншавальнай тэлеграме. — Ваша прадпрыемства ўносіць важкі ўклад у вырашэнне стратэгічнай задачы тэхнічнага пераасnашчэння аграпрамысловага комплексу краіны».

Кіраўнік дзяржавы выказаў упэўненасць, што эфектыўнае выкарыстанне работнікамі завода існуючага патэнцыялу і накопленага вопыту будзе і ў далейшым садзейнічаць развіццю вытворчасці высакаякаснай тэхнікі, запатрабаванай як на ўнутраным, так і на знешнім рынку.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## ТАК ЗАГАРТОЎВАЕЦЦА СТАЛЬ

У метале будзе адліта імя кіраўніка Беларускага металургічнага завода Мікалая Андрыянава. Таблічка з яго прозвішчам хутка з'явіцца на Дошцы гонару, куды занесены імёны ганаровых грамадзян Гомельскай вобласці.

**В. АЎРАМЕНКА.**

белагропромбанк
традиции будущего

Открытое акционерное общество
«Белагропромбанк»

СООБЩАЕТ, ЧТО 7 ОКТЯБРЯ 2008 года
ПРОВОДИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ
СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ

*220036, г. Минск, проспект Жукова, 3.*

ПОВЕСТКА ДНЯ

***1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.***

***2. Об утверждении дополнений и изменений в Устав ОАО «Белагропромбанк».***

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, — 25 сентября 2008 года.

Для получения бюллетеней для заочного голосования просим обращаться в ОАО «Белагропромбанк», его филиалы, отделения и расчетно-кассовые центры по месту нахождения акционеров.

Бюллетени для заочного голосования представляются не позднее 3 октября 2008 года.

С решениями, принятыми Общим собранием акционеров банка, можно будет ознакомиться в учреждениях ОАО «Белагропромбанк» после 17 октября 2008 года.

**Телефоны для справок: 8(017) 250 60 01, 228 53 00.**

КОНТАКТ-ЦЕНТР БАНКА 136

www.belapb.by

*Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ от 27.10.2006 г. № 2. УНП 100693551.*

Прамыя лініі

## Наш адказ дзіцячым інфекцыям

Як засцерагчы дзіця ад інфекцыйных хваробаў і прадухіліць ускладненні, выкліканыя апошнімі? Якія інфекцыі будуць «уладарыць» гэтай восенню і зімой? Каму і навошта трэба рабіць прышчэпку ад грыпу? Аб усім гэтым можна распытаць Іну Генадзьеўну ГЕРМАНЕНКУ, дацэнта, загадчыцу кафедры дзіцячых інфекцыйных захворванняў Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, галоўнага пазаштатнага спецыяліста Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь па дзіцячых інфекцыйных захворваннях.

Задаць свае пытанні можна па нумарах рэдакцыі: 8 (017) 292 38 21 і 292 38 92 у сераду, **1 кастрычніка, з 13.00 да 14.00.** Папярэднія пытанні пакідайце, калі ласка, па нумары 8 (017) 287 18 29.

## Як процістаяць сасудзістай паталогіі галаўнога мозга?

Аб асаблівасцях перамагання сасудзістых паталогій галаўнога мозга (інсультаў, анеўрызмаў і інш.), хірургічных метадах лячэння гэтых паталогій і сучасных дасягненнях айчыннай нейрахірургіі можна распытаць Арнольда Фёдаравіча СМЕЯНОВІЧА, прафесара, загадчыка нейрахірургічнага аддзела Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Неўралогія і нейрахірургія», члена-карэспандэнта Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь, Лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь.

«Прамая лінія» з яго ўдзелам адбудзецца ў рэдакцыі «Звязды», у аўторак, **7 кастрычніка, з 17.00 да 18.00.**

Званіце, калі ласка, па нумарах: 8 (017) 292 38 21 і 292 38 92. Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумары: 8 (017) 287 18 29.

## Дэфект пачакае да вясны?

***Патлумачце, калі ласка, з якога тэрміну будзе адлічвацца гарантыя, якую даў магазін на летнія пантофлі, выстаўленыя на распродаж. Я набыла іх 20 верасня, але надвор'е ўжо наўрад ці дазволіць мне іх насіць. І што рабіць, калі раптам у іх знойдзецца нейкі дэфект?***

**В. Кучынская,** *г. Чэрвень.*

Для сезонных тавараў (адзення, вырабаў з футра і г.д.) гарантыйныя тэрміны адлічваюцца з моманту надыходу адпаведнага сезона: з 1 красавіка — для тавараў вясnова-летняга асартыменту і з 1 кастрычніка — для тавараў восеньска-зімовага асартыменту. Для абутку сезоннага прызначэння гарантыйныя тэрміныноскі бяруць адлік: для зімовага — з 15 лістапада, веснавога — з 1 сакавіка, восеньскага — з 15 верасня і летняга — з 1 мая. Прычым ход гарантыйнага тэрміну спыняецца з надыходам сезона. Аднак трэба мець на ўвазе, што на мадэльны абутак гарантыя пачынае адлік непасрэдна з моманту пакупкі.

Як патлумачыла журналісту «Звязды» старшыня Беларускага таварыства абароны спажыўцоў Ганна Суша, з 29 студзеня 2009 года ўступіць ў сілу новая рэдакцыя Закона Рэспублікі Беларусь «Аб абароне правоў спажыўцоў». У новай рэдакцыі да выйшэпералічанага парадку ўтрымліваецца яшчэ адно ўдакладненне: «Калі ў сезонным тавары ў ходзе яго эксплуатацыі знойдуцца недахопы да наступлення адпаведнага сезона, гарантыйны тэрмін будзе адлічвацца з дня пачатку выкарыстання такога тавару, заяўленага спажыўцом». Гэта ўдакладненне значна спросціць стасункі спажыўца і прадаўца ў тым выпадку, калі апошні, каб не задавальняць прэтэнзіі спажыўца, раптам заявіць, што адпаведны сезон яшчэ не наступіў. А лета, восень і зіма, як мы пераканаліся, у нас цяпер прыходзяць у любы час года...

## МУСЛІН У «ДЫНАМА»

З пятніцы ў сталічным «Дынама» новы трэнер. Гэта сербскі спецыяліст Славалюб Муслін. Як паведамляе прэс-служба мінскага «Дынама», 55-гадовы сербскі трэнер заключыў з беларускім клубам пагадненне на два гады. Лепшы трэнер Беларусі Ігар Крыушэнка працаваў з камандай усяго дзевяць месяцаў.

## БАТЭ — ЛІДАР

25 верасня падапечныя Віктара Ганчарэнкі перамаглі ў гасцях «Гомель» з лікам 2:0. Бліжэйшы праследавацель, мінскі МТЗ-РІПА, згуляў у гасцях са «Смаргонню» ўнічыю 1:1. Сталічнае «Дынама» ўзяло верх над гродзенскім «Нёманам» — 1:0. Салігорскі «Шахцёр» саступіў на сваім полі магілёўскаму «Савіту» — 3:4, прайграючы да 25-й хвіліны 0:3. «Граніт» (Мікашэвічы) — «Дынама» (Брэст) — 2:2, «Тарпеда» (Жодзіна) — «Дарыда» (Ждановічы) — 2:0, «Днепр» (Магілёў) — «Віцебск» — 1:1, «Нафтан» (Наваполацк) — «Лакаматыў» (Мінск) — 2:1.

Выбары-2008

## АПРАЎДАЦЬ СПАДЗЯВАННІ

### У Цэнтрвыбаркаме разлічваюць на дастойную ацэнку выбараў — у адпаведнасці з прыкладзенымі намаганнямі

**Знаёміць масавую аўдыторыю з ходам і вынікамі парламенцкіх выбараў будзе 268 айчынных майстроў пяра і мікрафона і больш як 320 іх замежных калег. Гэта лічба не канчатковая — журналісты з іншых краін усё яшчэ прыбываюць у Беларусь і атрымліваюць акрэдытацыю МЗС. Для прадстаўнікоў мас-медыя створаны Інфармацыйны цэнтр ЦВК у Палацы Рэспублікі. Менавіта сюды будуць паступаць у рэжыме он-лайн усе самыя свежыя навіны аб ходзе галасавання 28 верасня. Ахвотнікі інфармацыі будуць занятыя з ранку і да самай ночы — акрамя заяў прадстаўнікоў Цэнтрвыбаркама і назіральнікаў можна разлічваць таксама на экспертныя заключэнні сацыёлагаў, паліталагаў ды іншых аналітыкаў...**

— Кіраўніком дзяржавы была пастаўлена задача зрабіць гэтыя выбары беспрэцэдэнтна празрыстымі, адкрытымі, даступнымі для ўдзелу ў іх усіх палітычных сілаў, якія дзейнічаюць у нашай краіне, а таксама для асвятлення прадстаўнікамі сродкаў масавай інфармацыі, — падкрэсліла старшыня Цэнтральнай камісіі Лідзія Ярмошына падчас прэзентацыі Інфармацыйнага цэнтра. — І я думаю, што гэтыя тры месяцы, якія доўжыцца выбарчая кампанія, нам (мабыць, іншы раз не вельмі ўдала, але мы ўсе прынамсі сумленна стараемся) удаецца выконваць пастаўленую задачу.

У гэтай сувязі яна прыгадала магчымасць браць удзел у рабоце Цэнтральнай камісіі з правам дарадчага голасу прадстаўнікам васьмі палітычных партый, стварэнне ўсіх магчымых умоў для вылучэння кандыдатаў у дэпутаты. «Пры гэтым у нас самае шырокае за апошні час прадстаўніцтва кандыдатаў ад палітычных сілаў, якія называюць сябе апазіцыйнымі», — дадала старшыня Цэнтрвыбаркама.

— Да нашага вялікага шкадавання, 10 прадстаўнікоў палітычных партый, што маюць вось гэтую накіраванасць, якая не стасуецца з афіцыйнай накіраванасцю ў нашай краіне — менавіта апазіцыйных палітычных партый, зняліся з рэгістрацыі па сваёй уласнай ініцыятыве. Хоць роўныя ўмовы для ўдзелу ў выбарах былі створаныя для ўсіх кандыдатаў у дэпутаты. На сёння ў выбарах удзельнічаюць 263 кандыдаты. На жаль, за апошнія два дні гэта лічба зменшылася яшчэ на два чалавекі.

Аднак паводле назіранняў Лідзіі Ярмошынай тыя прэтэндэнты ў Палату прадстаўнікоў, што засталіся на гэтай перадвыбарнай дыстанцыі, паводзяць сябе вельмі актыўна. Маўляў, Цэнтральную камісію закідваюць скаргамі кандыдатаў адзін на аднаго. «Кандыдаты раўнуюць выбаршчыкаў адзін да аднаго, і лічаць, што тыя ці іншыя прадстаўнікі знаходзяцца не зусім у роўных умовах». Пры гэтым палітычную сітуацыю падчас выбарчай кампаніі Лідзія Ярмошына ацаніла ў цэлым як спакойную.

— Прынамсі, мы не сутыкаемся з такімі зламыснымі праявамі чорнага піяру, з паклёпам і абразамі, якія можна было б назваць злоснымі, хоць невялікае пакусванне адзін аднаго ёсць.

Згадаўшы шырокую прадстаўнічасць назіральнікаў (ужо акрэдытавана 14 тысяч нацыянальных і 926 міжнародных назіральнікаў), Лідзія Ярмошына заявіла:

— Я спадзяюся, што даныя выбары, якія мы і задумалі як беспрэцэдэнтна свабодныя, адкрытыя і празрыстыя, апраўдаюць укладзеныя ў іх спадзяванні і перш за ўсё будуць прызнаныя выбаршчыкамі нашай краіны, ну і вядома ж, атрымаюць дастойную ацэнку ў міжнародных назіральнікаў, якія актыўна працуюць у нашай краіне па сутнасці з канца ліпеня.

Старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў зрабіла акцэнт на тым, што міжнародныя назіральнікі атрымалі ўсе магчымасці для таго, каб назіраць за выбарамі:

— Больш за тое, мы прадастаўлялі тыя паўнамоцтвы, якія і не прадугледжаны законам. Так міжнародныя назіральнікі прысутнічалі пры запісах кандыдатаў у дэпутаты на тэлебачанні. У іх была магчымасць рэальна пагля дзець, як непрадузята і роўна да ўсіх падыходзілі сродкі масавай інфармацыі, здзяйсняючы запіс выступленняў. Акрамя таго, ім была прадастаўлена магчымасць знаёміцца з працэсам вырабу бюлетэняў для галасавання ў друкарнях. Мы неаднаразова ўносілі ў свае пастановы тыя дапаўненні, якія грунтаваліся на прапановах міжнародных назіральнікаў. Так, былі прынятыя меры па дадатковай ахове скрыняў, якія выкарыстоўваюцца для датэрміновага галасавання. Такім чынам мы праяўлялі адкрытасць, мы рабілі крокі насустрач. І натуральна, гэтых крокаў насустрач мы чакаем і ад міжнароднага супольніцтва. Таму што зрабілі ўсё тое, што маглі зрабіць у рамках заканадаўства. І нават прадаставілі больш паўнамоцтваў, чым дае нацыянальнае заканадаўства.

Лідзія Ярмошына падкрэсліла таксама, што ва ўсіх буйных гарадах Беларусі прайшлі семінары з удзелам кіраўнікоў участковых камісій, падчас якіх яшчэ раз была пацверджана неабходнасць поўнага доступу перш за ўсё міжнародных назіральнікаў да ўсіх працэдур галасавання (у тым ліку арганізацыі галасавання на даму), а таксама падліку галасоў.

Каментуючы заклікі да байкоту выбараў, старшыня ЦВК адзначыла:

— У адпаведнасці з нашым законам даныя заклікі не забароненыя. Нельга займацца агітацыяй «за» і «супраць» толькі ў дзень выбараў — 28 верасня. Проста яны амаральныя і безадказныя з агульнаграмадзянскага пункту гледжання. Таму што любыя заклікі да дэстабілізацыі грамадзянскай абстаноўкі, на зрыў такой важнай выбарчай кампаніі, як фарміраванне нацыянальнага парламента, сведчаць аб безадказнасці тых, хто іх здзяйсняе. Нікому не будзе карысці ад таго, што выбары будуць сарваныя — гэта шкодна для любога грамадства і для любой дзяржавы. Гэта справа сумлення тых, хто гэтым займаецца. Аднак тыя палітычныя сілы, якія вызначаюць гэта як сваю палітыку, я думаю, што яны абрачоныя на выміранне.

**Ала МАЧАЛАВА.**

## ПАД НАГЛЯДАМ САЮЗНАЙ ДЗЯРЖАВЫ

Падчас сустрэчы ў Цэнтрвыбаркаме старшыня Цэнтральнай камісіі Лідзія Ярмошына ўручыла пасведчанне міжнароднага назіральніка Дзяржаўнаму сакратару Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы Паўлу Барадзіну. Старшыня ЦВК праінфармавала дзяржсакратара аб ходзе датэрміновага галасавання: «Няштатных сітуацый, якія б паставілі пад пагрозу волевыяўленне беларускіх грамадзян, не было». Яна таксама выказала спадзяванне, што выбарчыя ўчасткі наведаюць, як таго і патрабуе беларускае заканадаўства, больш за 50 працэнтаў грамадзян, якія валодаюць выбарчым правам. Лідзія Ярмошына спаслалася на выніkі сацыялагічных даследаванняў, паводле якіх, нагадаем, ахвотнікаў узяць удзел у галасаванні — больш чым 80 працэнтаў (улічваючы тых, хто сказаў цвёрдае «так» і выбраў адказ «хутчэй, вазьму ўдзел»). Таму ЦВК разлічвае, што 29 верасня можна будзе заявіць аб завяршэнні фарміравання Палаты прадстаўнікоў.

***Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 27.09.2008 г. (для б/н разлікаў)***

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 111,00 |
| 1 еўра | 3 075,20 |
| 1 латвійскі лат | 4 344,07 |
| 1 літоўскі літ | 890,79 |
| 1 чэшская крона | 125,85 |
| 1 польскі злоты | 916,43 |
| 1 расійскі рубель | 84,37 |
| 1 украінская грыўня | 417,07 |

***Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў***

**Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 25,0221 |
| 10 UAH | 49,2561 |
| 1000 BYR | 11,8476 |
| EUR | 36,5948 |

***Курс у гандлёвых кампаніях (на 26.09.2008 г.)***

| | |
|---|---|
| USD | 2135 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ 29.10.2008 г.

**«Минскгоримущество» (Продавец) совместно с УП «Минский городской центр недвижимости» (Организатор аукциона) проводят**

ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТА КОММУНАЛЬНОЙ СОБСТВЕННОСТИ г. МИНСКА

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Наименование объекта | Не завершенный строительством объект — «Пристроенный магазин № 29 по генплану в жилом квартале в границах улиц Червякова — Старовиленский тракт — переулок Озерный в г. Минске» |
| 2 | Местонахождение объекта | ул. Червякова, 5 |
| 3 | Общая площадь* (м кв.) | 20,2 |
| 4 | Начальная цена продажи (руб.) | 72 000 000 |
| 5 | Сумма задатка (руб.) | 7 200 000 |
| 6 | Сроки оплаты объекта | Оплата за объект производится в течение 30 календарных дней с момента подписания договора купли-продажи |
| 7 | Характеристика строения | Фундамент — ленточный из сборных железобетонных блоков; внутренние стены кирпичные; перекрытия железобетонные; витражи из алюминиевого профиля с двойным стеклопакетом. Степень готовности объекта по состоянию на 01.01.2008 г. — 70 % |
| 8 | Условия продажи | Сохранить функциональное назначение объекта в соответствии с проектной документацией. Компенсировать сверх цены продажи в течение 30 календарных дней с момента подписания акта приема-передачи объекта стоимость инженерных сетей, благоустройства и озеленения по состоянию на 01.01.2008 в сумме 3 928 060 рублей с индексацией на дату их перечисления по индексам изменения стоимости строительно-монтажных работ по элементам затрат по г. Минску по ресурсно-сметным нормам. Компенсировать сверх цены продажи в течение 30 календарных дней с момента подписания договора купли-продажи в бюджет г. Минска затраты, понесенные УП «УКС Мингорисполкома», по отоплению пристроенных помещений в сумме 2 496 113 рублей |

* Сведения о площади объекта, не завершенного строительством, даются на основании проектно-сметной документации.

1) Аукцион состоится 29 октября 2008 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

2) Для участия в аукционе необходимо предоставить в адрес УП «Минский городской центр недвижимости» следующие документы:

заявление на участие в аукционе по установленной форме;

юридическим лицам — резидентам Республики Беларусь — нотариально заверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации, представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) — доверенность;

представителям физических лиц — резидентов Республики Беларусь — нотариально заверенную доверенность;

юридическим лицам — нерезидентам Республики Беларусь — легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;

- документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иным финансово-кредитным учреждением, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;

- представители юридических и физических лиц — нерезидентов Республики Беларусь — легализованную в установленном порядке доверенность с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.

При подаче документов на участие в аукционе представитель юридического лица должен представить паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, а также документы, подтверждающие его полномочия на участие в аукционе и на подписание документов:

- руководитель юридического лица — документ о его назначении или избрании, а при необходимости — документ о его полномочиях, согласно уставу юридического лица;

- иные представители — доверенность, оформленную согласно учредительным документам юридического лица.

Физическое лицо (или его представитель, участвующий в аукционе по доверенности, удостоверенной нотариально) должно представить паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

соглашение о правах и обязанностях сторон;

заверенные банком копии платежных поручений, подтверждающих внесение:

а) задатка в сумме 10 % начальной цены;

б) платы за участие в аукционе в размере 4-х базовых величин. Денежные средства перечисляются на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, код 153001331, УНП 190398583.

Победителем торгов по каждому лоту признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Договор купли-продажи между Продавцом и Покупателем заключается в течение 10-ти рабочих дней с даты проведения аукциона. Оформление акта землепользования производится Покупателем.

Победитель аукциона обязан произвести оплату организатору аукциона за подготовку и проведение аукциона в размере 4 процентов от начальной цены продаваемого объекта и 5 процентов от суммы превышения цены продажи над начальной.

Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 28 октября 2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. **Телефоны для справок: 227 40 22, 228 48 36. Интернет: www.mgcn.by**

ISSN 1990 - 763X

# П'янству — прафілактыку, а з карупцыі — не спускаць вачэй

**Чарговая калегія Міністэрства ўнутраных спраў разгледзела пытанні арганізацыі работы органаў унутраных спраў па процідзеянні п'янству і сямейна-бытавым правапарушэнням, а таксама эфектыўнасць мераў па барацьбе з карупцыяй.**

Наогул крымінагенная сітуацыя гэтага года характарызуецца істотным скарачэннем злачыннасці, і ў першую чаргу злачынстваў цяжкіх і асабліва цяжкіх. «Не хацелася б, каб у той час як мы вырашылі вялікую колькасць праблем у процідзеянні злачыннасці, праблема сямейна-бытавых злачынстваў працягвала «вісець» над намі», — адзначыў міністр унутраных спраў Уладзімір НАВУМАЎ.

Дарэчы, на працягу 8 месяцаў гэтага года за ўжыванне алкагольных напояў у грамадскіх месцах або з'яўленне ў грамадскім месцы ў п'яным выглядзе да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнуты звыш 122 тысяч правапарушальнікаў, ліквідавана звыш 1 млн 230 тысяч літраў самагону і самагоннай брагі, выяўлена фактаў рэалізацыі звыш 490 тысяч літраў фальсіфікаваных спіртных напояў, этылавага спірту і спіртазмяшчальных вадкасцяў. У лячэбна-прафілактычныя ўстановы ізалявана ў адпаведнасці з рашэннем суда 3657 асобаў з сіндромам алкагольнай залежнасці, якія сістэматычна парушалі грамадскі парадак або правы грамадзян.

Што датычыцца барацьбы з карупцыяй, то тут хоць і нельга сказаць, што з'ява гэта шырока распаўсюджаная ў Беларусі, але ж, як заўважыў міністр, калі ёй не процістаяць хоць бы адзін дзень, то на другі яна пачне разрастацца. Па выніках 8 месяцаў выяўлена 2186 карупцыйных злачынстваў, з якіх большасць — органамі ўнутраных спраў. Гэта былі выпадкі як замаскіраваных раскраданняў, так і факты хабарніцтва. З 7 да 9 працэнтаў вырасла доля злачынстваў, калі хабар перавышаў 5 тысяч долараў.

— Што датычыцца ў цэлым забеспячэння парадку ў гэтыя дні, то мы перайшлі на ўзмоцнены варыянт нясення службы, — сказаў Уладзімір Навумаў журналістам. — У нас 6,5 тысячы выбарчых участкаў. На кожным праз суткі павінен дзяжурыць супрацоўнік, значыць, неабходна задзейнічаць 13 тысяч работнікаў міліцыі. Адпаведна, хтосьці павінен падмяніць іх на сваіх працоўных месцах, для чаго прыцягнуты нават не звязаныя з ахоў грамадскага парадку супрацоўнікі...

Сам міністр накіруецца на свой выбарчы ўчастак у нядзелю, вечарам.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

### ПЕРАД СУР'ЁЗНЫМ МАТЧАМ — ГРУНТОЎНЫ АГЛЯД

**Пропуск балельшчыкаў на матч Лігі чэмпіёнаў па футболе, які адбудзецца на стадыёне «Дынама» 30 верасня, будзе ажыццяўляцца ў адпаведнасці з міжнароднымі патрабаваннямі.**

Начальнік галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі Міністэрства ўнутраных спраў Яўген ПОЛУДЗЕНЬ заклікае балельшчыкаў не спазняцца і прыходзіць на стадыён загадзя, паколькі запуск пачнецца за 2,5 гадзіны і будзе суправаджацца сур'ёзным аглядам з металадэтэктарамі. Не рэкамендуецца браць з сабой вялікія рэчы, для якіх, праўда, на ўсякі выпадак прадугледжаны камеры захоўвання. Не дазволяць пранесці на стадыён і бутэлькі з вадой. Пакінуць пры сабе можна будзе толькі парасон.

Мяркуецца, што на матч Лігі чэмпіёнаў могуць прыехаць да 3 тысяч замежных балельшчыкаў. Колькі б гасцей ні прыехала на гульню, органы аховы правапарадку поўнасцю гатовыя забяспечыць належны парадак як на самім стадыёне, так і на блізкай да яго тэрыторыі.

Што датычыцца забеспячэння парадку на выбарчых участках, то міліцыя працуе цяпер ва ўзмоцненых умовах нясення службы. «Наша задача — забяспечыць захоўванне бюлетэняў у сейфах, а таксама парадак і бяспеку ў грамадскіх месцах» — кажа Яўген Полудзень. У месцах масавага збірання людзей могуць прымяняцца для агляду металадэтэктары.

**Святлана БАРЫСЕНКА**


## Извещение об открытом аукционе по продаже права проектирования и строительства

| | | |
|---|---|---|
| 1. | **Наименование объекта** | Право проектирования и строительства комплексной автозаправочной станции на земельном участке площадью 0,8953 га |
| 2. | **Местонахождение объекта** | г. Гродно, ул. Суворова |
| 3. | **Капитальные строения, подлежащие сносу, ориентировочный размер убытков** | Здание весовой, стоимостью 40 759 400 руб., здание гаражей, стоимостью 165 385 000 руб., здание мастерских, стоимостью 57 404 600 руб., здание гаражей, стоимостью 78 958 000 руб., здание проходной № 3, стоимостью 6 828 800 руб., площадка для складирования песка, стоимостью 307 929 928 руб., ограждение из ж/б плит, стоимостью 12 632 348 руб., ограждение из металлической сетки, стоимостью 10 059 233 руб., ворота деревянные, стоимостью 660 739 руб., сети электроснабжения (наружные), стоимостью 4 828 345 руб. |
| 4. | **Условие сноса** | Коменсация стоимости сносимых зданий в соотвествии с действующим законодательством |
| 5. | **Срок аренды земельного участка** | 50 лет |
| 6. | **Срок заключения договора на право проектирования и строительства здания** | 45 дней с момента подписания протокола о результатах аукциона |
| 7. | **Сведения об инженерных коммуникациях** | Информацию можно получить в ГП «Гродненский центр недвижимости» по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, каб. 57 |
| 8. | **Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории** | Информацию можно получить в ГП «Гродненский центр недвижимости» по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, каб. 57 |
| 9. | **Начальная цена продажи права проектирования и строительства** | 272 200 000 рублей |
| 10. | **Размер задатка** | 27 200 000 рублей |

**Принимать участие в аукционе могут только юридические лица и индивидуальные предприниматели**

При оформлении заявления желающие принять участие в аукционе представляют:

1) Копии платежных поручений о внесении задатка, 4-х базовых величин за подачу заявления на расчетный счет 3012000006896 в фил. 426 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 199, УНП 590727594, получатель – ГП «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении.

**Юридические лица:** Доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда данное юридическое лицо представляет его руководитель), копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации.

**Индивидуальные предприниматели:** Паспорт и копию свидетельства о государственной регистрации, а в случае участия в аукционе представителя индивидуального предпринимателя – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

**Иностранные юридические лица** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения, а также документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе), либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованными в установленном порядке переводами на белорусский (русский) язык.

**Представители иностранного юридического лица** – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;

Заявитель подписывает соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона установленной формы.

2) Платеж за объект осуществляется по безналичному расчету в расчетных билетах Национального банка РБ в течение 30 календарных дней с момента проведения аукциона.

3) В случае победы на аукционе заявитель обязан оплатить вознаграждение организаторам аукциона в размере 4 % от начальной цены продажи и 5 % от суммы превышения продажной цены над начальной.

4) Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектами.

5) Победитель аукциона получает аукционную документацию в ГП «Гродненский центр недвижимости», после полной оплаты цены, сложившейся в результате торгов.

**Аукцион состоится 28 октября 2008 года, в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2.** Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2, каб. № 57, в рабочие дни с 8.30 до 17.30. **Заявления принимаются с 29 сентября по 22 октября 2008 г.** Телефон для справок в Гродно: (0152) 720546. Адрес сайта: **www.gorod.grodno.by**


# Беларусь гатова ў бліжэйшай будучыні ажыццявіць здзіўляючы па магутнасці і імклівасці тэхналагічны рывок

**Такую думку выказаў памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — начальнік галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення Адміністрацыі Прэзідэнта Усевалад Янчэўскі.**

Паводле яго слоў, беларускі «Парк высокіх тэхналогій — гэта толькі першы крок нашай краіны на шляху да таго, што ў свеце называюць эканомікай ведаў».

Усевалад Янчэўскі падкрэсліў, што ўжо даўно прыціхлі тыя, хто спрабаваў гаварыць пра Беларусь як пра астравок застою, які застаўся ва ўчарашнім дні. «Сёння такіх размоў і разваг больш няма», — падкрэсліў памочнік Прэзідэнта. Паводле яго слоў, тая каласальная падтрымка, якую Прэзідэнт Беларусі аказаў Парку высокіх тэхналогій, дакладна гаворыць аб тым, што ў Беларусі стаўка сапраўды зроблена на інтэлект, а самае галоўнае — на ініцыятыву, умелую і свабодную творчасць людзей. «Я абсалютна ўпэўнены, што сёння наша краіна мае ўсе перадумовы для таго, каб у самай бліжэйшай будучыні ажыццявіць дзіўны па сваёй магутнасці і імклівасці тэхналагічны рывок», — адзначыў Усевалад Янчэўскі.

Рэзідэнты Парка высокіх тэхналогій плануюць абсталяваць некалькі камп'ютарных класаў у беларускіх сярэдніх школах. Першы такі клас адкрыўся ў СШ № 2 у Мар'інай Горцы (Пухавіцкі раён).

Як адзначыў на ўрачыстым адкрыцці класа дырэктар адміністрацыі Парка высокіх тэхналогій Валерый Цапкала, IT-галіна ў Беларусі развіваецца беспрэцэдэнтнымі тэмпамі не толькі для краін СНД, але і для еўрапейскіх. Так, аб'ём вытворчасці праграмных прадуктаў кампаніі рэзідэнтаў ПВТ і аб'ём экспарту штогод узрастаюць больш чым у 2 разы, з пачатку сёлетняга года ў парку створана больш за 700 працоўных месцаў.

**БЕЛТА.**

# РЭКЛАМА ПІВА — АГРЭСІЎНАЯ?

**Рэклама піва на тэрыторыі Беларусі апошнім часам пачала мець вельмі агрэсіўны і масіраваны характар. Гэта адбываецца на фоне алкагалізацыі насельніцтва. Так, калі ўзровень ужывання абсалютнага алкаголю ў 1995 годзе складаў каля 7 літраў на душу насельніцтва ў год, то летась гэты паказчык стаў набліжацца да 12 літраў. Пракуратура Беларусі ўпэўнена, што ўзмоцненая рэклама піва з усіх бакоў стала садзейнічаць таму, што сябраваць з алкагольнымі напоямі пачалі зусім маладыя жыхары нашай краіны.**

Генеральнай пракуратурай была праведзена выбарачная праверка таго, як выконваюцца патрабаванні заканадаўства аб рэкламе, у тым ліку пры размяшчэнні рэкламных ролікаў на тэлевізійных каналах і на транспарце, паведаміў журналістам н**амеснік начальніка аддзела Генеральнай пракуратуры па наглядзе за захаваннем правоў і свабод грамадзян Павел РАДЗІВОНАЎ.**

Спецыяліст пракуратуры адзначыў, што ў нашай краіне даволі лаяльнае заканадаўства, якое дазваляе рэкламу піва на тэлебачанні з 20.00, у той час, калі ў большасці краін Заходняй Еўропы і ў Расіі рэклама гэтага пеністага напою дазваляецца толькі пасля 22 гадзін. На тэлевізійных каналах нашай краіны такая сітуацыя, што яшчэ да дзіцячых праграм, напрыклад «Калыханкі», на гледачоў «льюцца» патокі піва. Пракуратура лічыць, што падобную сітуацыю неабходна выпраўляць.

Згодна з патрабаваннямі артыкула 18 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб рэкламе», забараняецца размяшчэнне рэкламы піва, дзе выкарыстоўваюцца вобразы, выказванні, якія пераконваюць гледачоў у тым, што ўжыванне піва садзейнічае дасягненню поспеху або паляпшае фізічны ці псіхалагічны стан чалавека. Разам з тым пракуратурай было выяўлена некалькі рэкламных ролікаў вытворцаў піва, у якіх выкарыстоўваюцца вобразы аб тым, што ўжыванне піва садзейнічае дасягненню поспеху ў процілеглага полу. У прыватнасці, відэаролік «Тэма. Сустрэча» гандлёвай маркі «Тэма» быў накіраваны на такое пераконванне моладзі для дасягнення поспеху. Рэклама піва «Тэма» за тры месяцы лета ажно 790 разоў выходзіла ў эфір тэлевізійных каналаў «НТБ», «РТР», «1 МУЗ», «БелМузТБ», «MTV»... Гэта рэклама круціцца на тэлеканалах і цяпер.

На тэлеканале «Сталічнае тэлебачанне» сёлета ў верасні пачалася трансляцыя мультыплікацыйнага роліка, які рэкламуе мінскія маркі марожанага «Каштан» і «Пламбір», дзе вясёлыя снегавікі нагадваюць наркагандляроў, якія правяраюць якасць наркотыкаў. Пракуратура ўпэўнена, што гэты ролік з рэкламай цудоўнага марожанага, па сутнасці, прапагандуе атрыманне асалоды ад пробы і ўжывання наркотыкаў, што ў адпаведнасці з часткай 3 артыкула 20 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб рэкламе» з'яўляецца неэтычным, бо парушае агульнапрынятыя нормы маралі.

Па агучаных фактах парушэнняў заканадаўства аб рэкламе Генеральная пракуратура Беларусі накіравала прадстаўленне ў Міністэрства гандлю з патрабаваннем разгледзець пытанне аб прыцягненні да адміністрацыйнай адказнасці асобаў, вінаватых у парушэннях, а таксама прыняць меры па спыненні дэманстрацыі рэкламнага відэароліка «Тэма. Сустрэча» і роліка, які рэкламуе марожанае «Каштан» і «Пламбір».

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Ёсць нагода

### ЧУЦЬ ВАЧЫМА І ГАВАРЫЦЬ ГОЛАСАМ

**Паэт эпохі Адраджэння П'ер дэ Рансар, аўтар «Сабору Парыжскай Божай маці» Віктар Гюго, пісьменнік і філосаф Жан-Жак Русо, італьянскі мастак Антоніа Станьёлі, кампазітар Людвіг ван Бетховен... Усіх іх аб'ядноўвае не толькі выключная адоранасць, але і фізіялагічная адметнасць — гэтыя знакамітыя асобы былі глухімі.**

На сёння, як сведчыць статыстыка, на парушэнні слыху пакутуе кожны дзявяты чалавек на планеце. Але ніхто з людзей, якія не чуюць, не лічыць сябе нямым — у глухіх ёсць мова жэстаў, такая ж багатая і насычаная, як 2500 іншых моў зямлі. А таксама ёсць у іх асаблівае свята — Міжнародны дзень глуханямых, які адзначаецца ў апошнюю нядзелю верасня.

Першую школу для глухіх людзей — Парыжскі інстытут глуханямых — адкрыў у 1760 годзе ў Францыі абат Шарль Мішэль Л'Эпе. Яго ж называюць заснавальнікам дакцільнай азбукі і адным з першых распрацоўшчыкаў мовы жэстаў. Сваю задачу абат бачыў у тым, каб навучыць вучняў «чуць вачыма і гаварыць голасам, вярнуўшы іх такім чынам грамадству». Праз два гады пасля смерці (ў 1789 годзе) Нацыянальная асамблея Францыі ўнесла імя абата Л'Эпе ў спіс дабрадзеяў чалавецтва і ўзяла пад апеку створаную ім школу. На пачатку XIX стагоддзя выпускнікі Парыжскага інстытута глуханямых пачалі адзначаць дзень нараджэння заснавальніка школы. Але канчатковая дата Міжнароднага дня глуханямых усталявалася пазней, у 1951 годзе, у гонар стварэння Міжнароднай федэрацыі глуханямых.

### ВЕДАЙ СВАЮ РЫЗЫКУ

**У апошнюю нядзелю верасня па ініцыятыве Сусветнай кардыялагічнай федэрацыі пад эгідай ЮНЕСКА праводзіцца Сусветны дзень сэрца. Сёлета ён пройдзе ўжо ў дзявяты раз у 79 краінах свету.**

Даследаванні вучоных у гэтай галіне паказваюць, што да 2025 года больш як 1,5 мільярда людзей — прыкладна кожны трэці чалавек пасля 25 гадоў — будуць мець высокі артэрыяльны ціск, які з'яўляецца адным з галоўных фактараў рызыкі хваробы сэрца і інсульту. А яго, у сваю чаргу, медыкі называюць «забойцай нумар два» пасля інфаркту міякарда.

Таму сёлета Сусветны дзень сэрца заклікае людзей: ведайце сваю рызыку! Пракансультуйцеся з медыкамі — ведаючы артэрыяльны ціск, узровень халестэрыну і цукру ў крыві, а таксама вагу, узрост і некаторыя іншыя паказчыкі, урачы могуць параіць, якой прафілактыкі прытрымлівацца, каб зменшыць рызыку захворванняў сэрца або ўзнікнення інсульту. Добразычлівая парада можа пазітыўна паўплываць на жаданне чалавека змяніць лад жыцця і захаваць здароўе.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

# ГЛАБАЛЬНЫ ЧАЛАВЕК

Асобы

Глобус — своеасаблівы падручнік для людзей, каб яны лепей маглі зразумець сябе і іншых, тых, хто існуе адначасова з імі на Зямным шары. Але ёсць яшчэ ў Беларусі Глобус-чалавек, які ў прынцыпе, робіць тое ж самае, толькі з дапамогай слоў (калі піша кнігі) і колераў (малюючы карціны). Адно другому не перашкаджае, а да двух першых яшчэ дадаецца і трэцяе (выдавецкая справа). Можна толькі павіншаваць з гэтым «глабальнага чалавека». І далучыцца да тых віншаванняў, якія ён прымае з нагоды свайго 50-годдзя.

За пяцьдзесят гадоў жыцця знойдзецца багата тых, хто засвоіў навуку пра людзей Адама Глобуса. Вунь нават сярод нашых чытачоў колькі такіх, хто мог пацікавіцца роздумамі пісьменніка пра жыццё ў яго аўтарскай рубрыцы «Добрыя людзі». Вядома ж, навука пра людзей, як і любая іншая, у адных выклікае цікавасць, другім увогуле да яе справы няма, а трэціх можа нават раздражняць. І, здаецца, пісьменнік у сваіх нататках часта свядома ідзе на тое, каб справакаваць у людзей рэакцыю — на словы, на іншага чалавека, ды ўласна на жыццё. Такі ён чалавек, гэты Глобус. І імкненне выклікаць рэакцыю іншых на сваю адкрытасць зрабіла яго ў значнай ступені знакавай фігурай у новай беларускай літаратуры. Сваё 50-годдзе ён сустракае аўтарам больш чым 20 кніг. З яго творчасцю маглі пазнаёміцца не толькі яго суайчыннікі — кнігі Адама Глобуса выходзілі ў Польшчы і Расіі, аповесці і апавяданні перакладаліся ў іншых краінах, такіх, як Вялікабрытанія, Германія, Славенія, Чэхія. Але яго



родная мова — беларуская, якая стала часткай спадчыны бацькі, пісьменніка Вячаслава Адамчыка. Але Глобус — адзін з тых літаратараў, хто ў свой час засведчыў, што гаварыць і пісаць па-беларуску і маральна, і натуральна, і модна. Што б ні было на ёй напісана: ці то эсэ, ці то верш, ці то нават сучаснае «хайку», вось як гэтае, якое вельмі добра адлюстроўвае характар самога аўтара:

*Перакулены*
*сьвет у калозе жыве...*
*Шпурляю камень*

## Абзац

■ **У гарадскім пасёлку Хоцімск учора адбыўся мітынг, прысвечаны 65-годдзю вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх акупантаў. Ва ўрачыстасцях узялі ўдзел дэлегацыі з суседніх раёнаў, а таксама госці з прыгранічных Клятнянскага і Суражскага раёнаў Расійскай Федэрацыі.**

■ 40 ветэранаў працы з пацярпелага ў грузіна-асецінскім канфлікце горада Цхінвалі прыедуць у Беларусь на санаторнае лячэнне. Курс аздараўлення — 21 дзень. Кошт пуцёўкі складае каля Br900 тыс. Госці будуць адпачываць і лячыцца ў санаторыях «Бярэсце», «Алеся», «Асілак».

■ **У Клімавічах супрацоўнікі міліцыі раскрылі разбойны напад на ўладальніка аўтамашыны. Напад здзейснілі 17-гадовы навучэнец Крычаўскага агратэхнічнага каледжа і двое непрацуючых з Крычаўскага раёна. Каля 20 гадзін побач з вёскай Царковішча Клімавіцкага раёна яны, пагражаючы нажом, выкінулі гаспадара «Фольксваген-Джэты», завалодалі аўтамабілем і з'ехалі ў невядомым напрамку. Пасля звароту пацярпелага ў міліцыю быў уведзены план «Перахоп». Праз некаторы час машына была выяўлена каля іншай вёскі, падазроных апазнаў пацярпелы. Узбуджана крымінальная справа.**

■ Новая італьянская лінія па вытворчасці керамічнай пліткі ўведзена ў строй у ААТ «Бярозабудматэрыялы». Магутнасць новай лініі — 3 млн кв. метраў пліткі ў год.

■ **Каля ўзбярэжжа Самалі, у нейтральных водах бліжэй да Кеніі, піраты захапілі ўкраінскае судна «Фаіна», на борце якога знаходзіўся 21 член экіпажа, у тым ліку 17 украінскіх грамадзян, трое грамадзян Расіі і адзін латвіец.**

■ Колькасць уладальнікаў мабільных тэлефонаў сёлета дасягнула чатырох мільярдаў, паведамляе Міжнародны саюз электрасувязі. Прычым 1,3 млрд з іх прыходзіцца на Бразілію, Расію, Індыю і Кітай. У апошнія 8 гадоў падпіска на новыя тэлефоны расла штогод на чвэрць. Яшчэ ў 2000 годзе мабільныя тэлефоны былі толькі ў 12 працэнтаў насельніцтва, а да канца года яны будуць у 61 працэнта жыхароў планеты.

■ **У Маскве выстаўлена на продаж сяміпавярховая кватэра за 76 млн еўра. Жыллё размешчана ў раёне Чыстых Прудоў, плошча кватэры — 1,3 тыс. квадратных метраў. У элітным комплексе 6 такіх кватэр. Кожны паверх займае ўсяго адзін «пакой»: на першым — басейн і зона адпачынку, на другім — гасцёўня, на трэцім — пакой адпачынку, паверхам вышэй — дзіцячы пакой, пяты і шосты — дзве спальні, на сёмым — кабінет, вышэй ідзе зімовы сад, а апошні паверх займае тэраса з выглядам на Маскву. Паркінг і інжынерныя сістэмы размешчаныя ў ніжніх паверхах. Спецыялісты прагназуюць з'яўленне на рынку яшчэ больш дарагіх кватэр, продаж якіх раней проста не афішавалі.**

## Поўны абзац

■ У Латвіі кліент абліў афіцыянтку гарачай кавай за тое, што яна размаўляла з ім на рускай мове. За хуліганства ён быў аштрафаваны. Аднак ён патрабуе кампенсацыі і сцвярджае, што дзяўчына, якая прыехала з Украіны, сама яго справакавала, адмовіўшыся абслугоўваць на дзяржаўнай мове.

■ **46-гадовы жыхар амерыканскага горада Боўлдэр (штат Каларада), які рухаўся на веласіпедзе, двойчы за дзень быў шпіталізаваны. Спачатку яго збіў аўтамабіль, а праз шэсць гадзін ён трапіў пад цягнік. З раніцы на веласіпедыста наехаў вадзіцель легкавіка, які знік з месца здарэння. Праз пяць гадзін пацярпелага з нязначнымі траўмамі выпісалі з бальніцы, і праз некаторы час паліцэйскія выявілі яго пад чыгуначным мостам — мужчына спрабаваў перасекчы яго ў недазволеным месцы і быў збіты чыгуначным саставам з вугалем. Цяпер бедалагу чакае штраф.**

■ Жыхар Луісвіля (ЗША) падаў іск супраць урача, які ампутаваў яго дзетародны орган у ходзе запланаванай аперацыі абразання. Аперацыю 61-гадоваму пацыенту праводзілі год таму, урач павінен быў выканаць абразанне для лячэння запаленчага працэсу. Аднак у працэсе ўмяшання хірург выявіў ракавую пухліну хворага органа і прыняў рашэнне аб яго ампутацыі, не спытаўшы дазволу ў хворага ці яго жонкі. Па словах пацярпелага, пасля аперацыі ён адчуў шок, душэўныя пакуты, боль і страту інтарэсу да жыцця. Адказчыкамі па справе, акрамя хірурга, выступаюць анестэзіёлаг і клініка, у якой праходзіла аперацыя. Аналагічны выпадак адбыўся ў 1997 г. у Індыянаполісе, тады істцу была выплачаная кампенсацыя ў памеры 2,3 млн долараў.

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

## Падрабязнасці

# КІЛЕР ДЛЯ КАМПАНЬЁНА-КАНКУРЭНТА

**У гэтай крымінальнай справе, як паведамілі нам у прэс-службе ўпраўлення КДБ Беларусі па Гомельскай вобласці, асаблівасцю з'яўляецца тое, што тут фігуруе пісталет як частка аплаты за аказанне паслугі: расправіцца са «здраднікам». Быў ён кампаньёнам, стаў канкурэнтам. Прэч яго з дарогі! Але па парадку.**

У 2006 годзе Пётр А. і Міхаіл В. заснавалі фірму па вытворчасці арміруючага профілю для пластыкавых вокнаў. Абсталяванне належала Пятру, а вытворчыя плошчы — Міхаілу. Мужыкі-прадпрымальнікі працавалі дружна і зладжана, сумленна дзялілі прыбытак. Але вось Пётр разведаў, што яго партнёр пачаў выраб указанай прадукцыі, так сказаць, нелегальна. За яго спінай фактычна стаў канкурэнтам. Здраднік, ды і толькі, які можа падвесці ў любы момант і па іншай справе. Скандал, адным словам, вынікам якога стаў гаспадарчы суд, які яшчэ не вынес свайго рашэння.

У адказ на гэта Міхаіл вырашыў да канца ісці на «ворага». А менавіта: фізічна знішчыць яго, для чаго і пачаў пошукі, хто б узяўся за гэту справу. Знайшоў нарэшце. Спартсмен, які ў свой час трапіў за краты за рабаўніцтва, а цяпер меў фінансавыя цяжкасці, калі выйшаў на волю. Дамовіліся аб аплаце за забойства: пасля выканання работы — 600 долараў ЗША, а папярэдні аванс — пісталет ТТ і патрон да яго.

Кілера гэта поўнасцю задавальняла. І ён, як гаворыцца, гатовы быў прыступіць да справы. Але тут Міхаіл перадумаў і ўнёс новую прапанову: трэба збіць канкурэнта на горкі яблык, і праінструктаваў, як ажыццявіць расправу. «Аперацыя» была прадумана да дробязяў. Указаны час, месца і спосаб збівання. Ніхто не здагадаецца, хто гэта зрабіў, бо і сам заказчык, і выканаўца быццам бы ў гэты момант будуць знаходзіцца за межамі Беларусі.

Але задуманае правалілася, бо ажыццяўленню злачыннага плана перашкодзілі аператыўнікі УКДБ па Гомельскай вобласці. Міхаіла арыштавалі, і неўзабаве ён сядзе на лаву падсудных.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

### АДПОМСЦІЎ

Пінская міліцыя завяла крымінальную справу на падставе факта падпалу дзвярэй у кватэры аднаго з дамоў па вуліцы Фядотава. Дзверы загарэліся днём і гаспадар не ведаў, што і думаць. А міліцыя доўга не шукала, бо падпал зрабіў сусед.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

# У месяцы верасні

Бяседныя песні

На бясёдзе — як у жыцці. Тут усё арганічна спалучаецца. І размова — нязмушаная, шчырая: з сябрамі — задушэўная, з калегамі — змястоўная, а калі абрадавая — абавязкова добразычлівая. І чарка падымаецца не раз, каб падтрымаць весялосць, ажыўленасць размовы, імклівасць абуджанага духу, каб замацаваць паразуменне, дамоўленасць. А песня лучыць бяседнікаў, нітуе і размову, і чарку, робіць бяседу адметнай з'яваю ў людской супольнасці.

Як у рэчаіснасці — так і на бяседзе: усё ў руху, у зменлівасці. Сур'ёзная размова ажыўляецца жартамі, а кампанейскі, часам юрлівы, гумар выклікае ўдумлівыя развагі. І ўвесь бяседны рэй падсвечваецца песняй, духоўнай ахоўніцай сябрыны. Нібы хвалі, набягаюць адна за адной песні. І народныя, і аўтарскія. Патрыятычныя змяняюцца лірычнымі, за імі спяваюцца і жартоўныя, у якіх за гарэзлівасцю, гуллівасцю вымалёўваюцца істотныя жыццёвыя моманты.

Народныя песні заўсёды напоўнены глыбокім сэнсам. Мастацкая вобразнасць дакладна і пераканальна перадае яго змест і характар. У песні «У месяцы верасні», якую «Песняры» зрабілі вельмі папулярнай, з самага пачатку праказваецца вынік несуладнасці людскіх адносінаў. Звяглівы характар старой параўноўваецца з вераснёўскай парошай, якая губіць і ўраджай, і надзеі... Аднак людскі дух неўміручы, пра што і сцвярджаецца ў канцы песні.

**Беларуская народная песня**

*У месяцы верасні*
*Выпала пароша.*
*Дзед бабу палюбіў,*
*Што баба хароша.*

*І крывая, і сляпая,*
*Яшчэ к таму злая:*
*І крычыць, і бурчыць,*
*Проці дзеда не змаўчыць.*

*— Убірайся, бабка,*
*У новае белле —*
*Я ж цябе павяду*
*З сабой на вяселле.*

*Узяў жа дзед бабку*
*За белу ручку*
*Ды спіхнуў дзед бабку*
*З моста ў рэчку.*

*— Цяпер, бабка, кайся —*
*Трошкі пакупайся...*
*А як бабка узнырне —*
*То дзед кіем падпіхне.*

*Прыйшоў дзед дадому*
*І пачаў бажыцца:*
*— Ох, ох, далібог,*
*Не буду жаніцца.*

*Адумаўся дзедка,*
*Ды ўспляснуў у ладкі:*
*— Калі буду жыў-здароў,*
*Пайду шукаць бабкі.*

**Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН.**


## Извещение об открытом аукционе по продаже земельных участков в собственность в г. Гродно

| Номер лота | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Наименование объекта** | Земельный участок У-69К | Земельный участок У-70К | Земельный участок У-71К | Земельный участок У-72К | Земельный участок У-73К | Земельный участок У-74К | Земельный участок У-75К | Земельный участок У-76К |
| **Местонахождение объекта** | м-н «Южный-4» | м-н «Южный-4» | м-н «Южный-4» | м-н «Южный-4» | м-н «Южный-4» | м-н «Южный-4» | м-н «Южный-4» | м-н «Южный-4» |
| **Площадь земельного участка (га)** | 0,1140 | 0,1115 | 0,1116 | 0,1255 | 0,1226 | 0,1111 | 0,1207 | 0,1207 |
| **Кадастровый номер** | 440100000003004036 | 440100000003004037 | 440100000003004038 | 440100000003004039 | 440100000003004051 | 440100000003004055 | 440100000003004058 | 440100000003004059 |
| **Начальная цена продажи** | 10 000 000 руб. | | | | | | | |
| **Сумма задатка** | 1 000 000 руб. | | | | | | | |
| **Сумма возмещения расходов, связанная с проведением аукциона** | 2 544 450 руб. | | | | | | | |

| Номер лота | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Наименование объекта** | Земельный участок У-77К | Земельный участок У-78К | Земельный участок У-79К | Земельный участок У-80К | Земельный участок У-81К | Земельный участок У-82К | Земельный участок У-83К |
| **Местонахождение объекта** | м-н «Южный-4» | м-н «Южный-4» | м-н «Южный-4» | м-н «Южный-4» | м-н «Южный-4» | м-н «Южный-4» | м-н «Южный-4» |
| **Площадь земельного участка (га)** | 0,1215 | 0,1203 | 0,1191 | 0,1143 | 0,1123 | 0,1115 | 0,1084 |
| **Кадастровый номер** | 440100000003004060 | 440100000003004061 | 440100000003004062 | 440100000003004063 | 440100000003004064 | 440100000003004065 | 440100000003004066 |
| **Начальная цена продажи** | 10 000 000 руб. | | | | | | |
| **Сумма задатка** | 1 000 000 руб. | | | | | | |
| **Сумма возмещения расходов, связанная с проведением аукциона** | 2 544 450 руб. | | | | | | |

Аукцион проводится с условием: Строительство и обслуживание жилого дома в течение 3-х лет с момента принятия решения горисполкома о передаче участка в частную собственность.

Земельный участок победителю аукциона предоставляется на праве собственности. Инженерные коммуникации на земельных участках отсутствуют.

Организатор аукциона: ГП «Гродненский центр недвижимости»

При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

1) Копии платежных поручений о внесении **задатка, 4-х базовых величин** за подачу заявления на расчетный счет 3012000006896 в фил. 426 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 199, УНП 590727594, получатель – ГП «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении

**Юридическое лицо:** Доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда данное юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов.

**Физическое лицо:** Паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

2) Платеж за объект осуществляется по безналичному расчету в расчетных билетах Национального банка РБ в течение 30 календарных дней с момента проведения аукциона.

3) В случае победы на аукционе победитель возмещает расходы, связанные с проведением аукциона.

4) Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектами.

5) Аукционные торги состоятся при наличии не менее 2-х участников по выставленным лотам.

**Аукцион состоится 28 октября 2008 года, в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2.** Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2, каб. № 57, в рабочие дни с 8.30 до 17.30. **Заявления принимаются с 29 сентября по 22 октября 2008 г.** Телефон для справок в Гродно: (0152) 720546. Адрес сайта: **www.gorod.grodno.by**

Пагаварылі...

## На мушцы карабіна быў чалавек

**Адзін гамяльчанін, знаходзячыся на балконе сваёй кватэры, пачуў сварку суседзяў з кватэр ніжэйшых паверхаў, якая ўшчэнт яго разззлавала. У грубай форме ён даў каманду спыніць яе. Гэта ў сваю чаргу абразіла мужчыну, які скандаліў з дзвюма жанчынамі, і той накіраваўся да ўказчыка, каб высветліць з ім адносіны.**

Ніякай размовы не адбылося, бо той, раззлаваны, вырашыў правучыць таго, раздражнёнага. Калі апошні пачаў тузаць ручку дзвярэй, першы з цікавасцю сачыў за ім праз дзвярное вочка. Потым узяў карабін, прыцэліўся, і куля прашыла дзверы. Раздражнёнаму пашанцавала, бо яна праляцела за некалькі сантыметраў ад яго галавы.

Суд устанавіў, што гаспадар карабіна раней быў паляўнічым, ды запіў да такой ступені, што нідзе не працаваў, і жонка замыкала яго ў кватэры, ідучы на працу. У суседа ён страляў, знаходзячыся ў стане алкагольнага ап'янення. Застаецца спадзявацца, што за тры гады знаходжання ў папраўча-працоўнай калоніі ўзмоцненага рэжыму ў яго жыцці наступіць пералом.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

**по продаже государственного имущества и права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества**

| Наименование предмета аукциона | Здание бывшей базовой школы в комплексе с прилегающими постройками и право заключения договора аренды земельного участка |
|---|---|
| Местонахождение недвижимого имущества | Брестская область, Барановичский район, д. Мицкевичи |
| Продавец недвижимого имущества | Отдел образования Барановичского райисполкома, г. Барановичи, ул. Советская, 79, тел (0163) 45 23 45 |
| Характеристика предмета аукциона | Здание школы 1-эт., площадь – 662 кв.м, фундамент – бутобетон, стены – кирпичные, крыша – шиферная; здание котельной площадью 56 кв.м, фундамент – бетонный, стены – кирпичные, крыша – шиферная; сарай 1-эт., площадь – 92 кв.м, фундамент – деревянные стулья, стены – дощатые, крыша – шиферная; здание интерната 1-эт., площадь – 278 кв.м, фундамент – бетонный, стены – кирпичные, крыша – шиферная; здание овощехранилища 1-эт., площадь – 16 кв.м, фундамент и стены – бетонные, крыша – 3 слоя рулонной гидроиз.; артскважина глубиной 57 м.<br>Земельный участок площадью 1,5684 га; с ограничениями в использовании земель (0,0118 га в охранной зоне линий электропередач), срок аренды – 25 лет. |
| Начальная цена предмета аукциона, руб. | 483 049 830 |
| Сумма задатка, руб. | 48 304 000 |
| Организатор аукциона | *Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел. (0162) 23 44 06, 23 12 63, 20 87 85, www.brest-region.by, e-mail: fond@brest-region.by* |

Аукцион состоится **28 октября 2008 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

**Для участия в аукционе представляются:**

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество».

2. Заверенные банком копии платежных поручений:

- о внесении суммы задатка на р/с 3642202530011 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНН 200020538;

- о внесении специального сбора за подачу заявления на участие в аукционе в размере 4 базовых величин и платы за регистрацию участников аукциона в размере 0,5 базовой величины на р/с 3600201000015 филиал № 100 БОУ АСБ «Беларусбанк», код 246, назначение платежа 03107, УНН 200300543, получатель платежа – финансовое управление Брестского облисполкома.

3. Юридическими лицами – доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально заверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации.

4. Индивидуальными предпринимателями – нотариально заверенная копия свидетельства о государственной регистрации.

5. Иностранными юридическими лицами – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.

6. Представителями иностранных юридических лиц или иностранных граждан, лиц без гражданства – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.

7. Представителями граждан и индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь – нотариально заверенная доверенность.

8. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь и представители иностранных юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержд. постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462.

Участник, ставший победителем аукциона, обязан: подписать протокол аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка: внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы в случае рассрочки), возместить расходы по формированию и регистрации земельного участка и расходы на подготовку и проведение аукциона, после чего не позднее 2 рабочих дней заключить с продавцом недвижимого имущества договор купли-продажи недвижимого имущества, а с местным исполнительным комитетом договор аренды земельного участка.

***Заявления на участие в аукционе с необходимым пакетом документов принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 404, 405, фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 13.00 с 14.00 до 17.30 по рабочим дням по 27 октября 2008 года включительно.***

Бяспечная дарога

# ВАДЗІЦЕЛЯМ — ЦІШЭЙ, ПЕШАХОДАМ — ЯРЧЭЙ

## ДАІ нагадвае пра флікеры і асцярожнасць



**Шэрыя восеньскія дні, дажджы і туманы, раннія прыцемкі, кароткі светлавы дзень, замаразкі... Гэта не метэаралагічная зводка, а папярэджанне Дзяржаўтаінспекцыі. Надышоў час для вадзіцеляў быць максімальна асцярожнымі на слізкім дарожным пакрыцці, а для пешаходаў — абавязкова абазначыць сябе ў цемры флікерамі.**

Пра гэта нагадвае чытачам «Звязды» начальнік УДАІ УУС Магілёўскага аблвыканкама Віктар Волкаў.

***— Віктар Васільевіч, а вы пераканалі сваякоў насіць флікеры?***

— Жонка носіць прывязанае да сумкі святлоадбівальнае сардэчка. І не трэба было пераконваць. Аднойчы, гады тры таму, я выехаў на дарожна-транспартнае здарэнне ў Бялыніцкі раён, і падчас разбору і афармлення мяне ледзь не збілі на дарозе. Таму я хутка дастаў з кішэні флікеры і апрануў павязкі адразу на дзве рукі. Гэты выпадак навучыў на ўсё жыццё.

А на жаль, здаралася, што і збівалі інспектараў ДАІ ў падобных сітуацыях. У Кіраўскім раёне былі параненыя 4 работнікі міліцыі: яны разбіраліся з ДТЗ і іх размятаў па дарозе аўтамабіль. Таму святлоадбівальныя элементы цяпер ёсць у кожнага нашага супрацоўніка, і мы актыўна ў гэтым кірунку працуем з насельніцтвам.

***— А ў гэтай кампаніі ўсеагульнай флікерызацыі ёсць вынікі?***

— Амаль на 40 працэнтаў зменшылася колькасць наездаў на пешаходаў. Праўда, я адразу хачу сказаць: флікер не з'яўляецца абсалютным гарантам таго, што вы не трапіце ў аварыю. Аднак трэба зрабіць усё, што залежыць ад вас, каб абазначыць сябе на дарозе і адвесці небяспеку.

На жаль, ёсць такія прыклады, калі не дапамагалі ні флікер, ні нават спецыяльная камізэлька для веласіпедыста. Напрыклад, 18 верасня на ўскраіне Магілёва аўтамабіль збіў 40-гадовую веласіпедыстку. Жанчына была абазначаная належным чынам, але загінула. Вадзіцель з месца здарэння збег: ён быў пазбаўлены вадзіцельскіх правоў, але ўзяў машыну сябра і сеў за руль.

***— Аднак выпадкаў, калі загінулі пешаходы, не абазначаныя на дарозе, значна болей.***

— Можа гэта і груба, але падобныя прыклады — лепшая прафілактыка. Напрыклад, у Кругланскім раёне чалавека збіў аўтамабіль, ён загінуў. Калі сталі разбірацца, то ў яго хаце знайшлі на цвіку тры флікеры. Калі хоць бы адзін быў на ім, то трагедыі, можа, і не здарылася б. Затое цяпер уся вёска, дзе жыў той чалавек, ведае, што флікеры — жыццёва неабходная рэч.

Ну чаму нашы людзі заўсёды думаюць, што непрыемнасць здарыцца з кім заўгодна, але толькі не з імі?

***— Можа, чалавеку проста хочацца верыць у лепшае.***

— Разумны чалавек павінен перш за ўсё паклапаціцца пра сваю бяспеку, хваляваца за дзяцей і бацькоў. Зрабіць усё, каб абараніць жыццё і здароўе.

І мне крыўдна, што многія вадзіцелі ставяць сваё аўто на стаянку і ідуць у цёмны час без аніякіх флікераў. Не паважаюць сваіх калег...

***— ...Хоць, можа, яшчэ дзясятак хвілін таму лаяліся на пешаходаў, якіх не бачна ў цемры.***

— Трэба як можна больш казаць пра флікеры і пераконваць людзей. Нашы супрацоўнікі перш за ўсё ідуць па вёсках і ў працоўныя калектывы. Мы агітуем каля сельскіх магазінаў. Таму што 80 працэнтаў ахвяраў наездаў — гэта людзі, якія злоўжываюць спіртнымі напоямі і не носяць флікеры.

Вось свежы прыклад: 21 верасня ў Чэрыкаўскім раёне па цэнтры дарогі ішоў чалавек. Флікера не было, затое ў заплечніку ляжала пустая бутэлька з-пад таннага віна. Мужчыну збілі і ён памёр. Прычым вадзіцель з месца здарэння з'ехаў, схаваўся і нават імітаваў крадзеж аўтамабіля. Вадзіцеля затрымалі, але асоба ахвяры наезду яшчэ не ўстаноўлена: верагодна, што гэты чалавек не меў пэўнага месца жыхарства.

***— Любы вадзіцель са свайго вопыту скажа, што пешаходы на неасветленых вуліцах бачацца проста цёмнымі рухомымі ценямі.***

— У нас у Магілёве амаль усе вуліцы асветленыя, ёсць тратуары і пешаходныя дарожкі. Аднак ёсць і ўскраіны, дзе гэтага зусім няма — Дачны, Грабянёва... І там збіваюць людзей. Так што і гараджанам будзе зусім не лішнім насіць флікер.

Ну што за цяжкасць? Вобразу вытанчанай жанчыны не пашкодзіць бірулька на сумцы, мужчыну пасуюць павязкі на руках. А дзеці абавязкова павінны свяціцца ў цемры.

***— За парушэнне гэтых правілаў інспектары ДАІ настроеныя строга штрафаваць?***

— Сёлета мы ўжо наклалі спагнанне на амаль 9 тысяч чалавек. Ведаеце, мы ў вёсках рабілі падворныя абходы. І ў нашых спісах ёсць такія людзі, якім па некалькі разоў давалі бясплатныя флікеры, неаднойчы гутарылі, а яны зноў ходзяць па абочынах неабазначанымі ў цемры. Тады будзе штраф да паловы базавай велічыні. Калі аштрафуюць некалькі разоў на месяц — вельмі адчувальна, асабліва для вяскоўца.

***— Адчувальна для ўсіх. Лепей на гэтыя грошы набыць карысныя рэчы. Таму прасцей апрануць флікер.***

— Тым больш, што ў верасні на дарогах Магілёўскай вобласці рэзка абвастрылася абстаноўка. За няпоўны месяц адбыліся 73 дарожна-транспартныя здарэнні, у якіх 75 чалавек атрымалі раненні і 23 загінулі. Для параўнання: летась за такі ж перыяд загінулі толькі 6 чалавек.

***— А з чым вы гэта звязваеце?***

— Вадзіцелі носяцца, перавышаюць хуткасць. Пешаходы за летні сезон забыліся на флікеры. Цямнее раней, і калі яшчэ пайшоў дождж, слізка і дрэнная бачнасць — чакай аварый, у якіх пацерпяць людзі.

Мы сёння размаўляем пра флікеры, але і вадзіцелі павінны стрымаць хуткасць. 20 верасня ў Асіповіцкім раёне паблізу вёскі Ясень адбылося здарэнне са смяротным вынікам: 46-гадовы жыхар Асіповічаў парушыў правілы абгону, не справіўся з кіраваннем, з'ехаў у кювет і збіў 54-гадовую жыхарку Бабруйска, якая на абочыне шашы збірала грыбы. А калі б ехаў цішэй, не абганяў бяздумна — можа, і жанчына была б жывая.

***— Якія вашы пажаданні ўдзельнікам дарожнага руху?***

— Усім — і вадзіцелям, і пешаходам: будзьце ўважлівыя на дарогах. Не за гарамі зіма, вадзіцелям варта падумаць аб замене колаў. Ды і цяпер ужо па начах з'яўляецца галалёд. Пешаходам раю ўлічваць таксама стан дарожнага пакрыцця і памятаць, што аўтамабіль на галалёдзе спыніцца імгненна проста не можа: перш чым пераходзіць дарогу, трэба ўпэўніцца, што цябе прапускаюць. Патрэбна ўзаемная культура паводзінаў — вадзіцеляў і пешаходаў.

**Гутарыла Ілона ІВАНОВА.**

Навіны сталіцы

## Аўтавакзал «Цэнтральны» будзе гатовы да 2011 года

**Будаўніцтва новага будынка аўтавакзала «Цэнтральны» плануецца завяршыць да 2011 года, паведаміў куратар праекта, дырэктар па развіцці ААТ «БНК інжынірынг» Сяргей Куніцкі.**

Цяпер на будаўнічай пляцоўцы ўжо скончана перакладка шматлікіх інжынерных камунікацый і будаўнікі пачалі рыць катлаван для закладкі падмурка будынка. Аўтавакзал па форме будзе нагадваць экспрэс, які спыніўся на прывакзальнай плошчы. Непасрэдна аўтавакзал зойме толькі частку комплексу, які будуецца. Мяркуецца, што тут будуць абслугоўваць каля пяці тысяч пасажыраў у дзень. На першым паверсе, згодна з праектам, размесціцца зала чакання, касавая зала з барам і іншыя памяшканні. Уваход у камеры захоўвання — з вуліцы. Большую частку комплексу зойме пяціўзроўневы паркінг на 500 машына-месцаў. Акрамя гэтага на чатырох паверхах будынка размесціцца гандлёвы цэнтр.

**Вікторыя ГУЛЬКО, «Мінск—Навіны».**

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

**на право заключения договора аренды земельного участка для размещения объекта строительства**

| Наименование предмета аукциона | Право заключения договора аренды земельного участка для строительства объекта придорожного сервиса (пункт питания) | Право заключения договора аренды земельного участка под строительство объекта придорожного сервиса (автомобильной заправочной станции, станции технического обслуживания, пункта питания, пункта постоя и охраняемой стоянки) |
|---|---|---|
| Номер лота | 1 | 2 |
| Арендодатель земельного участка | Столинский районный исполнительный комитет, Брестская область, г. Столин, ул. Советская, д. 69 Тел. 8(01655) 2 26 09 | Ивацевичский районный исполнительный комитет, Брестская область, г. Ивацевичи, ул. Ленина, д. 44 Тел. 8(01645) 2 13 69 |
| Адрес земельного участка/ Кадастровый номер земельного участка | Брестская область, Столинский район, 110, 650 км автодороги Р-88 Житковичи—Давид—Городок—граница Украины /№ 125800000001000072 | Брестская область, Ивацевичский район, 479 (лево) на автодороге Р-43 граница РФ—Кричев—Бобруйск—Ивацевичи/№ 123400000001000747 |
| Размер (площадь) земельного участка, га | 0,0375 | 0,14979 |
| Срок аренды земельного участка, лет | 50 | 99 |
| Целевое назначение земельного участка | Под строительство объекта придорожного сервиса (пункт питания) | Под строительство объекта придорожного сервиса (автомобильной заправочной станции, станции технического обслуживания, пункта питания, пункта постоя и охраняемой стоянки) |
| Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций и сооружений | Участок свободен от строений и сооружений.<br>На земельном участке имеются ограничения в использовании земель в охранной зоне линии электропередачи напряжением 110 кВт и водоохраной зоне реки Сырец на площади 0,0375 га * | Участок покрыт лесом. РУП «Белтелеком» на площади 0,0804 га заняты транспортными коммуникациями (подземная кабельная линия связи). Установлены ограничения в использовании земельного участка в связи с его расположением в охранной зоне подземной кабельной линии электросвязи и радификации на площади 0,0804 га |
| Начальная цена предмета аукциона, руб. | 185 750 | 156 000 820 |
| Размер задатка, руб. | 18 575 | 15 600 080 |
| Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона, условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории | - внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка;<br>- возмещение победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка;<br>- возмещение убытков в сумме 23 210 рублей, причиненных ОАО «Горынский агрокомбинат» изъятием земельного участка;<br>- заключение победителем аукциона со Столинским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в 2-месячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок;<br>- получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство объекта;<br>- осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией;<br>- снятие плодородного слоя почвы и использования его для улучшения малопродуктивных земель ОАО «Горынский агрокомбинат» | - внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка;<br>- возмещение победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка;<br>- возмещение убытков в сумме 7 984,03 тыс. руб., причиненных ГЛУ «Барановичский лесхоз» изъятием земельного участка;<br>- права вырубки деревьев и реализации древесины ГЛУ «Барановичский лесхоз» в установленном порядке;<br>- возмещение победителем аукциона в установленном порядке потерь лесохозяйственного производства в сумме 26 492,0 тыс. руб., вызванных изъятием земельного участка площадью 0,6656 га (покрытие лесом) для использования его в целях не связанных с ведением лесного хозяйства (строительство автозаправочной станции и охраняемой стоянки), перечислив их на транзитный счет инспекции Министерства по налогам и сборам по месту постановки на учет предприятия, код платежа 05202;<br>- заключение победителем аукциона с Ивацевичским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в 2-месячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации прав на земельный участок;<br>- получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство объекта;<br>- осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией;<br>- снятие плодородного слоя почвы и использования его для благоустройства объекта |
| Организатор аукциона | *Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, д. 11. Тел. (0162) 23 44 06, 23 12 63, 20 87 85 www.brest-region.by, e-mail: fond@brest-region.by* | |

** Правила охраны электрических сетей напряжением до 1000 вольт, утвержденные постановлением Совета Министров СССР от 24 марта 1984 г. № 255, Положением о порядке установления размеров и границ водоохранных зон и прибрежных полос водных объектов и режиме ведения в них хозяйственной деятельности, утвержденное постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 21 марта 2006 г. № 377.*

Аукцион состоится **31 октября 2008 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

Для участия в аукционе приглашаются юридические лица всех форм собственности и индивидуальные предприниматели. Участнику необходимо подать заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество». **Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают:** заверенные банком копии платежных поручений:

- о внесении суммы задатка на р/с 3642202530011 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНН 200020538;

- о внесении специального сбора за подачу заявления на участие в аукционе в размере 4 базовых величин и платы за регистрацию участников аукциона в размере 0,5 базовой величины на р/с 3600201000015 филиал №100 ОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 246, назначение платежа 03107, УНН 200300543, получатель платежа – финансовое управление Брестского облисполкома;

индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представитель индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность;

представитель или уполномоченное должностное лицо юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представитель или уполномоченное должностное лицо иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представитель иностранного гражданина – легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе индивидуальные предприниматели, представители индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Осмотр земельных участков на местности осуществляет арендодатель.

Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене.

**Участник, ставший победителем аукциона, после проведения аукциона обязан:** подписать протокол о результатах аукциона в день аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы в случае предоставления рассрочки), возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, формированием земельного участка для размещения объекта строительства, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка, после чего, но не позднее 2 рабочих дней, заключить с местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с «Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договора аренды земельных участков», утвержденного Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462 с учетом требований Указа Президента Республики Беларусь от 27 декабря 2007 г. № 667 «Об изъятии и предоставлении земельных участков».

***Заявления на участие в аукционе с необходимым пакетом документов принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 404, 405 фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 13.00 с 14.00 до 17.30 по рабочим дням с 29 сентября 2008 г. по 27 октября 2008 года включительно.***

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

БЕЗ РЭЦЭПТА

## Апетыт і надвор'е

Метэазалежным людзям важна сачыць за рэжымам харчавання. Пры неспрыяльных атмасферных абставінах выключыце з рацыёну вострыя прыправы і алкагольныя напоі, аддайце перавагу малочна-расліннай дыеце і не пераядайце. Штодня піце паболей чыстай вады і больш знаходзьцеся на свежым паветры. Калі вы вельмі цяжка пераносіце атмасферныя ваганні, паменшыце яшчэ фізічную і разумовую нагрузку.

ДЛЯ ВАШАЙ КАРЫСЦІ

## Яблычны цуд



**Здаецца, пра яблыкі мы ведаем усё ці амаль усё. Яны змяшчаюць шмат вітамінаў, мінералаў і вельмі карысных пажыўных рэчываў. «Кожны дзень з'ядайце яблык, і вы зэканоміце на лекары», — сцвярджаюць знаўцы. Уніклівыя вучоныя падлічылі, што нам неабходна з'ядаць 48 кг яблыкаў на год, а 100 г яблыкаў па антыаксідантным дзеянні эквівалентна 1500 мг вітаміну С.**

У старажытнасці яблыкі, запечаныя ў попеле кастра, народныя лекары давалі хворым на прастуду, а надзёртыя і змешаныя з тлушчам прыкладвалі ў выглядзе мазі да трэшчын на вуснах і сасках жанчын, якія кармілі немаўлят. Не так даўно вучоныя выявілі, што штодзённае ўжыванне яблыкаў папярэджвае многія хваробы. Карысныя яблыкі курцам. У тых, хто есць яблыкі кожны дзень, лёгкія працуюць лепш, чым у тых, хто іх не есць. Медыкі тлумачаць падобнае дзеянне яблыкаў наяўнасцю ў іх антыаксідантаў, якія ахоўваюць лёгкія ад уздзеяння тытунёвага дыму і іншых шкодных прымесяў, што прысутнічаюць у паветры. Каб яблыкі хутчэй засвойваліся, есці іх лепш надзёртымі на тарцы.

Хочаце пахудзець? Рабіце сабе адзін раз на тыдзень яблычны разгрузачны дзень. Ён карысны і тым, у каго павышаны артэрыяльны ціск. З'ядайце 1,5 кг свежых яблыкаў на дзень і нічога не піце.

**Дзеля прыгажосці**

Яблыкі дораць нам не толькі здароўе, але і прыгажосць. І ўсё таму, што яны змяшчаюць неабходныя арганізму мінеральныя рэчывы (калій, фосфар, кальцый, магній, натрый, жалеза) і вітаміны (С, Е, карацін, $B_1$, $B_2$, $B_6$, PP, фоліевую кіслату) у аптымальных для чалавека спалучэннях, што садзейнічае выдатнаму засваенню арганізмам. Дзякуючы ім лепшымі становяцца скура і валасы.

З яблыкаў можна зрабіць маскі для скуры. Так, маска з надзёртага яблыка добра ўвільгатняе самую сухую скуру, толькі перад тым, як нанесці сумесь на твар, змажце яго любым алеем. Для **нармальнай скуры** надзярыце яблык на тарцы, змяшайце з 1 ч. лыжкай смятаны ці аліўкавага алею і 1 ч. лыжкай крухмалу. Нанясіце на твар і шыю на 20 хвілін, затым змыйце цёплай вадой. Для **тлустай скуры** разрэжце яблык на кавалачкі, адварыце ў невялікай колькасці малака. 2 ст. лыжкі яблыка змяшайце з бялком курынага яйка. Атрыманую кашку нанясіце на скуру на 20 хвілін, потым змыйце.

Для **сухой скуры** змяшайце надзёрты на дробнай тарцы яблык, 1 ч. лыжку мёду і 1 ст. лыжку размолатых у кавамолцы аўсяных шматкоў. Нанясіце на твар і шыю на 20 хвілін, змыйце.

Калі вас **непакояць вяснушкі**, надзярыце ў аднолькавай прапорцыі яблык і хрэн. Налажыце сумесь на твар на 15 хвілін, затым змыйце. Вяснушкі і пігментныя плямы паблякнуць.

**Агрубелую скуру рук** энергічна памасіруйце на працягу 2—3 хвілін кавалачкам ababранага яблыка. Рукі памыйце, змажце крэмам.

Калі **трэскаюцца вусны**, змяшайце працёрты яблык з 1 ч. лыжкай сметанковага масла і нанясіце на вусны.

-2528-

МЕНЮ ЗДАРОЎЯ

## Восеньская асалода

**Кожнаму фрукту — свой час. Вось і настаў ён для паласатага кавуна, мядовай дыні, сакавітага вінаграду ды сінявокай слівы. Гэтыя восеньскія прысмакі — выдатныя натуральныя ачышчальнікі, якія падрыхтуюць арганізм да прыходу зімы: умацуюць імунітэт, вызваляць клеткі ад шкодных рэчываў, што назбіраліся.**

### Закуска «Восеньскі капрыз»



*4 кавалкі кавуна, апельсін, нектарын (манга), 100 г маслін (без костачак), 2 ст. лыжкі лімоннага соку.*

Аблупіце скурку, выдаліце насенне і акуратна выражце сярэдзіну ў кавалках кавуна. Разлажыце кольцы кавуна на талеркі, запоўніце сярэдзіну дробна парэзанымі маслінамі, апельсінамі, нектарынам. Перад падачай на стол абпырскайце закуску лімонным сокам.

**Валодаючы мачагонным дзеяннем, кавун нармалізуе работу нырак, мачавога пухіра, печані, ад стану якіх у многім залежыць наша самаадчуванне.**

### Запяканка «Чароўная слівянка»



*8 лустачак чэрствага белага хлеба, 250 г сліў, 2 яйкі, 2 ст. лыжкі цукру, 200 г тварагу, шклянка малака.*

Замачыце лустачкі хлеба ў малацэ. Выдаліце костачкі ў сліў. Намажце алеем глыбокую патэльню, пакладзіце ў яе слаямі злёгку адціснуты хлеб і слівы. Зверху заліце сумессю, прыгатаванай з узбітых яек, цукру і тварагу. Пастаўце патэльню ў духоўку на 30—40 хвілін. Да гатовай запяканкі добра падаць смятану, растопленае масла, варэнне.

**Слівы, што ўваходзяць у склад запяканкі, багатыя на калій, вітамін С, клятчатку. Яны акажуць паслабляльнае дзеянне на кішэчнік, адрэгулююць дзейнасць нырак і сардэчна-сасудзістай сістэмы.**

### Жэле «Забава»

*200 г вінаграду (лепш цёмнага), 2 свежыя яблыкі, 50 г цукру, 15 г жэлаціну, 1,5 шк. вады.*

Прамыты без костачак і галінак вінаград пакладзіце ў каструлю, заліце вадой і гатуйце 30 хвілін на слабым агні. Атрыманую масу астудзіце, пратрыце праз сіта. Змяшайце з жэлацінам, папярэдне замочаным на 30—40 хвілін у халоднай вадзе. Дадайце ў вінаграднае пюрэ цукар, пракіпяціце памешваючы. Астудзіце, разліце жэле ў формачкі, на дно якіх пакладзіце кубікі яблыкаў. Пастаўце дэсерт для застывання ў халадзільнік.

**Сакавітыя гронкі вінаграду багатыя на магній, які забяспечвае бесперабойную работу кішэчніка. Каб падсілкаваць арганізм жалезам, неабходным для нармалізацыі крывятварэння, налягайце на цёмныя гатункі вінаграду.**

КРУПІНКІ КЕМЛІВАСЦІ

## Новая «сукенка» для грэлкі

Не спяшайцеся выкідваць стары шарсцяны світар. Яго яшчэ можа «панасіць» ваша грэлка. Адрэжце світар да таліі, адпарыце рукавы. На адлегласці 1—2 см ад краю прастрачыце (каб вочкі не распаўзліся). Цяпер сшыйце чахол для грэлкі (горла грэлкі павінна супадаць з гарлавінай світара). Такая «сукенка» будзе значна даўжэй захоўваць цяпло, а сама грэлка стане больш прыемнай навобмацак.

-2529-

## ЮРЫЙ ЧАРНЫШОЎ, ГЕНЕРАЛЬНЫ ДЫРЭКТАР ААТ «ГРОДЗЕНСКАЯ ТЫТУНЁВАЯ ФАБРЫКА «НЁМАН»:

# «МАДЭРНІЗАЦЫЯ ВЫТВОРЧАСЦІ — ГАРАНТЫЯ БУДУЧЫХ ПОСПЕХАЎ»

**Гродзенская тытунёвая фабрыка «Нёман» — лідар сярод прадпрыемстваў Гродзеншчыны па шматлікіх паказчыках. Ды адзін з іх, напэўна, найбольш значны для жыхароў вобласці і краіны. Не, маецца на ўвазе не колькасць ці якасць выпускаемай тут прадукцыі, якую мы назіраем штодня ў пабытовым жыцці. Гутарка ідзе пра іншае. Адкрытае акцыянернае таварыства «Гродзенская тытунёвая фабрыка «Нёман» больш за ўсіх у Гродзенскай вобласці выплачвае падаткаў, а ў Беларусі па гэтым паказчыку ўваходзіць у пятнаццатку лепшых. Таму слушна кажучы пра шкоду курэння, трэба памятаць і пра фінансавы бок, дзякуючы якому ў належным стане трымаецца сацыяльная сфера.**

**Дарэчы, генеральны дырэктар фабрыкі Юрый Чарнышоў летась прызнаны адным з лепшых кіраўнікоў вобласці. Наконт ганаровага звання ён кажа: «Калі кіраўнік лепшы, значыць і прадпрыемства лепшае». З гэтым нельга не пагадзіцца. Хоць так было не заўсёды.**



***— Юрый Сцяпанавіч, Гродзенская фабрыка з XIX стагоддзя мае вядомасць у тытунёвай індустрыі Еўропы, уваходзіла калісьці ў тройку буйнейшых вытворцаў сваёй галіны СССР. Тым не меней, параўнальна нядаўна пакупнікі перавагу аддавалі імпартнай прадукцыі. Якім чынам сітуацыя была зменена?***

— На самай справе, у 1990-х спажыўцы неахвотна куплялі айчынную прадукцыю, перавагу аддаючы новаму імпартнаму тавару. Каб стварыць канкурэнцыю, а гэта значыць палепшыць якасць прадукцыі, найперш патрабавалася іншае абсталяванне. Пасля наведвання фабрыкі Прэзідэнтам краіны Аляксандрам Лукашэнкам пачалося адраджэнне прадпрыемства. Дзякуючы дзяржаўнай падтрымцы з 2000 па 2002 год ішла рэканструкцыя і тэхнічнае пераабсталяванне, на што было затрачана 48 мільярдаў рублёў. Але на той час рынак ужо аказаўся перапоўнены замежным таварам. Так, напрыклад, у 2005 годзе на складах фабрыкі знаходзілася незапатрабаванай прадукцыі больш чым на 52 мільярды рублёў.

**КАНТАКТНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ**

**Адрас:**
**230771, г. Гродна, вул. Арджанікідзе, 18**

**Аддзел маркетынгу:**
тэл.:+375 152 522 076, 522 074, факс +375 152 522 075
e-mail: market@mail.qrodno.by

**Аддзел рэалізацыі:**
тэл. +375 152 525 206, 524 952, факс +375 152 541 974

**Прыёмная:**
тэл. +375 152 525 161, факс +375 152 565 334


Машыніст Вольга ЖУК.

***— Выбачайце, Юрый Сцяпанавіч, здаецца, менавіта тады — тры гады таму, вы і былі прызначаны генеральным дырэктарам...***

— Так. І першым крокам стала распрацоўка стратэгіі выхаду прадпрыемства са складанай сітуацыі. Мы пачалі працаваць не на аб'ём, не «на склад», а непасрэдна на попыт. Было відавочна, што толькі мадэрнізацыя вытворчасці — гарантыя будучых поспехаў. Гэтым прынцыпам кіруемся і цяпер. Фабрыка дасягнула пэўнага піку. Рынак ужо сфарміраваўся і падзелены паміж вытворцамі і імпарцёрамі. У адпаведнасці з дзяржаўнай праграмай імпартазамяшчэння перад прадпрыемствам стаіць задача выпускаць новую прадукцыю. У маі 2007 года закупілі вытворчую лінію за 4,5 мільёна еўра ў італьянцаў, сёлета набываем яшчэ адну — за 4 470 000 еўра — у немцаў. Яе ўстаноўка адбудзецца ў лістападзе. Дзякуючы новаму абсталяванню, плануем асвоіць усе сусветныя брэнды, якія існуюць у гэтым сегменце. А ў наступным годзе закупім яшчэ адну лінію — ужо за 5 630 000 еўра. Частка старога абсталявання будзе заменена на больш прадукцыйнае і эканамічнае.

Між іншым, задачу, якую перад намі ставілі Прэзідэнт краіны і Урад, мы выканалі: разлічыліся з усімі крэдытамі, што бралі на рэканструкцыю, а гэта 65 мільярдаў рублёў.

***— Наколькі ведаю, да гэтага часу не было забракавана ніводнай партыі прадукцыі фабрыкі. Зразумела, што якасць дасягаецца не толькі за кошт мадэрнізацыі. Ці не самае істотнае — сыравіна...***

— Магчыма, нехта не ведае, што ад сыравіны залежыць не толькі якасць прадукцыі, але і яе кошт — дзякуючы скарачэнню выдаткаў пры вытворчасці. Мы цалкам адмовіліся ад пасрэднікаў, на чым таксама зэканомілі. Высакаякасную сыравіну купляем з 20 краін, сярод якіх Аргенціна, Бразілія, Калумбія, Кітай, Турцыя ды іншыя. Пры падрыхтоўцы да выпуску новай прадукцыі ўсё пачынаецца з аналізу рынку, для якога сёння характэрна значнае зніжэнне смол і нікаціну. Між іншым, мы будзем закупляць і новае лабараторнае абсталяванне. На фабрыцы ўжо ёсць адна адмысловая машына, другая — толькі ў Дзяржстандарта. Існуе на прадпрыемстве дэгустацыйная камісія, куды ўваходзяць не толькі працаўнікі лабараторыі і маркетынгу, але і прадстаўнікі пастаўшчыка сыравіны. Дэгустацыя праходзіць кожны тыдзень. Такія камісіі існуюць ва ўсіх абласных цэнтрах Беларусі.

Пры падрыхтоўцы новай прадукцыі запрашаем спецыялістаў міжнароднага класа — брэнд-майстроў. Таму што падабраць рэцэптуру, куды ўваходзіць 20 розных гатункаў, вельмі няпроста. Тытунь — складаная культура. Напрыклад, вірджынія. Ёсць кітайская, аргенцінская, бразільская. І яны адрозніваюцца. А вось у якасці інгрэдыентаў выкарыстоўваюць мясцовыя дабаўкі.

***— А дзе навучаюць спецыялістаў тытунёвай вытворчасці?***

— У Беларусі такіх устаноў няма. Спецыялістаў для нашай галіны рыхтуе Кубанскі дзяржаўны тэхналагічны універсітэт. Што ж датычыцца брэнд-майстроў, гэта — унікальныя людзі. Іх у свеце можна пералічыць па пальцах. Да нас прыязджалі з Даніі, з Лацінскай Амерыкі. Прадстаўнік Расіі неяк сказаў: мне яшчэ шмат вучыцца. А самому — 45. Чуў, што ёсць жанчына пад 90 гадоў, якую дастаўляюць для падборкі гатункаў тытуню на адмысловым самалёце і за вялікія грошы...

***— Пра шкоду курэння казаць не трэба — агульнавядома. А ці не з'яўляецца вытворчасць «Нёмана» шкоднай экалагічнай?***

— Скажыце, якая шкода ад спальвання сена? Ніякай. Тое ж і з тытунём. Самі мяркуйце: адно са знакамітых расійскіх прадпрыемстваў нашай галіны знаходзіцца ў цэнтры Масквы... Хоць у бліжэйшы час думаем стварыць новую сістэму кандыцыянавання і вентылявання, што павінна добра адбіцца на прадукцыі. Дый для працаўнікоў пойдзе на карысць. Мы ўкладваем значныя сродкі ў сацыяльную сферу, каб людзі сябе на прадпрыемстве адчувалі камфортна. Пра гэта сведчыць і медыцынская дапамога, ды і цэны ў нашай сталоўцы значна ніжэйшыя, чым у горадзе.

***— А заробак?***

— Сярэдні заробак на 1 верасня склаў 1 200 000 рублёў, што на 30 % вышэй за аналагічны перыяд мінулага года.

***— На прадпрыемстве працуе амаль тысяча чалавек, якія патрабуюць увагі. Але вы, ведаю, падтрымліваеце і вяскоўцаў...***

—Так, ААТ «Гродзенская тытунёвая фабрыка «Нёман» мае сельскагаспадарчы філіял «Хамчыцы» Свіслацкага раёна. Гаспадарка знаходзілася ў заняпадзе. Таму пасля яе далучэння мы дапамаглі тэхнікай, абсталяваннем. Адным словам, уклалі значныя сродкі, каб не толькі падтрымаць вяскоўцаў, але і дапамагчы развівацца далей. Гэта ўжо наша падраздзяленне, а іх поспехі радуюць і абнадзейваюць.

***— Сёння вельмі актуальна стаіць пытанне эканоміі паліўна-энергетычных рэсурсаў. Як ладзяцца справы ў вас?***

— Вядома ж, мы выконваем Дырэктыву Прэзідэнта краіны № 3 па эканоміі паліўна-энергетычных рэсурсаў. Напрыклад, улічваючы тое, што фабрыка працуе кругласутачна, укаранілі раздзельны ўлік электраэнергіі. Эканоміі спрыяе і мадэрнізацыя вытворчасці, бо з яе ўлікам набываецца новая тэхніка і сыравіна.

***— І апошняе пытанне, якое я не мог не задаць, бо яно актуальнае для ўсіх галін беларускай вытворчасці. Маю на ўвазе экспарт вашай прадукцыі.***

— Тытунёвая галіна практычна не мае імпарту. За выключэннем знакамітай гаванскай маркі. Гэта — закрытая прастора для «чужынцаў». Прабіцца на замежны рынак вельмі складана. Але мы спрабуем. Некалькі партый адгрузілі ў Іран, плануем адкрыць прадстаўніцтва ў Расіі. Паўтаруся: гэта вельмі няпроста. Але мы свае намаганні не спынім. Наша прадукцыя сертыфікавана на адпаведнасць патрабаванням міжнароднага стандарту СТБ ІСО 9001—2001 — гэта першы і адзіны ў тытунёвай галіне нашай краіны сертыфікат. Ён пацверджаны нямецкім супольніцтвам па акрэдытацыі. Калектыў ААТ «Гродзенская тытунёвая фабрыка «Нёман» зладжаны, на станоўчы вынік працуюць усе: і тэхнічныя работнікі, і менеджары, і, вядома ж, рабочыя. Яны цэняць сваю працу і разумеюць, што ад іх намаганняў залежаць поспехі прадпрыемства, а значыць і ўласны дабрабыт.

**Гутарыў**
**Міхась ДУБРОВІЦА.**

УНП 500047627

### З ГІСТОРЫІ

***Датаю ўтварэння Гродзенскай тытунёвай фабрыкі лічыцца 17 ліпеня 1861 года. Бізнэс яе заснавальнікаў — купцоў Шарашэўскіх — стаў равеснікам большасці сусветна вядомых фірмаў, а фабрыка ўвайшла ў лік вядучых тытунёвых выторчасцяў Расійскай Імперыі. У 1882 годзе на прамысловай выставе ў Маскве прадукцыя Гродзенскай тытунёвай фабрыкі была адзначана медалём Аляксандра Імператара Усерасійскага. «Срэбра» было заваявана ў Амстэрдаме (1884 г.) і ў Новым Арлеане (1885 г.), а таксама ў 1889 годзе на сусветнай выставе ў Парыжы.***













### З ГІСТОРЫІ

***У пачатку Вялікай Айчыннай вайны фабрыка была практычна знішчана. Яе аднаўленне пачалося ў 1945 годзе, а ў 1964-м было створана тытунёвае вытворчае аб'яднанне «Нёман», у якім фабрыка стала галоўным прадпрыемствам.***

***1 студзеня 1988 года аб'яднанне было ператворана ў Гродзенскую тытунёвую фабрыку «Нёман». 29 снежня 2000 года яна была зарэгістранавана як Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Гродзенская тытунёвая фабрыка «Нёман».***


Машыніст Таццяна ЗУБРЫЦКАЯ.


Машыніст-рэгуліроўшчык Яўген СІДЗЮК.

### ТОЛЬКІ ФАКТ

***Тэмпы росту аб'ёму вытворчасці ААТ «Гродзенская тытунёвая фабрыка «Нёман» на 1 верасня ў суадносных цэнах у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года склалі 110 працэнтаў.***



### ТОЛЬКІ ФАКТ

***ААТ «Гродзенская тытунёвая фабрыка «Нёман» больш за ўсіх у Гродзенскай вобласці выплачвае падаткаў.***

Цэх вытворчасці фільтрапалачкі.
Машыністы Марына САРОКА і Ірына ЮЗАПЧУК.


Машыніст паточна-аўтаматычных ліній Аляксандр ШАЎЛОЎСКІ.

### ТОЛЬКІ ФАКТ

***Сярэдняспісачная колькасць работнікаў прадпрыемства — 989 чалавек.***

***Сярэднямесячны заробак — 1 200 000 рублёў.***


Машыніст-рэгуліроўшчык Андрэй ЯНЧАЛОЎСКІ.

